№№31–32
(2759–2760)

29 лютага 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

Вадзім Папоў гаворыць пра рэферэндум

Праект Канстытуцыйнага акта саюзнай дзяржавы практычна гатовы да разгляду на вышэйшым Дзяржсавеце. Пра гэта заявіў Вадзім Папоў, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Аднак разгляд адбудзецца пасля выбараў прэзідэнта Расіі і яго інаўгурацыі, заявіў Папоў. Паводле яго слоў, калі Дзяржсавет ухваліць дакумент, то ў Беларусі і Расіі адначасова мусіць прайсці рэферэндум.

Абрабаваны філіял «Беларусбанка»

Зламыснік абрабаваў філіял "Беларусбанка" ў пасёлку Сасновы Бор Светлагорскага раёна.

Гэта адбылося ў абедзенны перапынак. У 13.10 у дзверы філіяла банка пастукаў невядомы, які прадставіўся інкасатарам і папрасіў адчыніць дзверы. Старшы касір адчыніла дзверы, злачынца ўдарыў яе па твары, выкраў 9 мільёнаў рублёў і ўцёк.

Супрацоўнікі праваахоўных органаў праводзяць аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы для ўстанаўлення асобы рабаўніка.

Справа пішацца

У Мінску адбываюцца допыты падазроных па крымінальнай справе за арганізацыю масавых беспарадкаў падчас прадпрымальніцкай акцыі 10 студзеня.

Яна была разагнаная мінскім АМАПам, усе затрыманыя ўдзельнікі шэсця былі пакараныя 15-суткавымі арыштамі, а па факце масавых беспарадкаў была заведзеная крымінальная справа.

Актывіст "Маладога фронту" Уладзімір Сяргееў учора даведаўся, што праходзіць па ёй падазроным.

Апроч Сяргеева, у спісе шэраг іншых маладзёжных актывістаў -- Алесь Стральцоў, Таццяна Цішкевіч, Аляксандр Чарнышоў, а таксама Андрэй Кім, сябра арганізацыі "Ініцыятыва", які ўжо больш за месяц утрымліваецца ў СІЗА па абвінавачанні ў збіцці міліцыянера.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Аляксандр ЗДЗВІЖКОЎ:

«У Беларусі я не адчуваю сябе ў бяспецы»

Намеснік галоўнага рэдактара зачыненай уладамі недзяржаўнай газеты "Згода" Аляксандр Здзвіжкоў, які быў асуджаны на тры з паловай гады за перадрукоўку ў газеце карыкатур на прарока Мухамеда, стаў яшчэ адным палітзняволеным, якога на мінулым тыдні вызвалілі беларускія ўлады.

Фармальна прыгавор быў зменены ў сувязі са змякчаючымі абставінамі — цяжкім станам здароўя яго маці. Праз некалькі дзён пасля вызвалення Здзвіжкоў сустрэўся з журналістамі і расказаў пра акалічнасці сваёй крымінальнай справы, пра ўмовы ўтрымання ў зняволенні і пра далейшыя планы.

— Спачатку я хачу папрасіць у вас прабачэння за тое, што не з'явіўся перад брамай турмы на Валадарскага пасля свайго вызвалення, — сказаў Здзвіжкоў. — Я меркаваў, што супраць мяне можа быць учынена правакацыя. Вы ведаеце, у Беларусі існуе такая практыка, калі чалавеку выдаецца на рукі даведка аб вызваленні, а літаральна ля турэмнай брамы супраць яго ўчыняецца правакацыя, і яго зноў вядуць да следчага. Я проста перастрахаваўся.

— Што прымусіла вас у лістападзе мінулага года вярнуцца ў Беларусь? Вы ж ведалі пра крымінальную справу...

— Калі хочаце, я прыехаў сюды за адрэналінам. У лістападзе скончыў свой чарговы раман, адчуваў спустошанасць, мяне цягнула ў Беларусь. Я цудоўна разумеў, што мяне могуць кінуць за краты, але было спадзяванне, што ва ўлады хопіць розуму не чапаць мяне. Атрымалася тое, што атрымалася. Мяне кінулі за краты і абвінавацілі ў "распальванні рэлігійнай варожасці". Суд зрабілі закрытым, на маю думку, таму, што не хацелі, каб пра гэты ганебны ў юрыдычным сэнсе працэс даведалася шырокая грамадскасць.

— Вы не прызналі сябе вінаватым, хаця на судзе прызналі, што перадрукавалі гэтыя карыкатуры свядома...

— Так, гэта быў свядомы ўчынак. І я дагэтуль не лічу, што абразіў пачуцці вернікаў. І тое, што адбывалася падчас следства і суда, няхай застанецца на сумленні тых, хто гэта зрабіў. Што казаць, калі адзін з двух тамоў маёй крымінальнай справы быў складзены на падставе адміністрацыйных спраў, заведзеных супраць мяне яшчэ ў 2005 годзе? Праўда, прыгавор тэрмінам у тры з паловай гады азначае, што для беларускіх улад я з'яўляюся дзяржаўным злачынцам...

— І як да "дзяржаўных злачынцаў" ставяцца ў месцах зняволення?

— Сваё зняволенне я называю "творчай камандзіроўкай". Бо можна колькі заўгодна доўга слухаць тых, хто сядзеў там, але калі ўсё гэта перажываеш сам — разуменне зусім іншае. І я вам шчыра скажу, што зараз у беларускіх турмах метадычна і штодзённа адбываюцца катаванні зняволеных.

— Што вы маеце на ўвазе?

— Ці не катаванне тое, што ў камеры №225, што знаходзіцца ў сутарэнні турмы на Валадарскага, на дваццаць "шконак" прэтэндаваў 31 чалавек? Людзям прыходзілася спаць у літаральным сэнсе пазменна. (Што да мяне, то па крымінальных паняццях я, як палітычны зняволены, "цягну мазу за людзей", таму мне выдзелілі пастаянныя нары.)

Ці не катаванне тое, што ў камеры ніколі не выключаецца цьмяная лямпачка, пры якой ні чытаць, ні пісаць проста немагчыма?

Ці не катаванне тое, што ў камерах СІЗА КДБ, у так званай "амерыканцы", дзе мне таксама давялося прасядзець пэўны час, тэмпература зімой — блізу 10 градусаў, у той час як у кабінеце следчага тэмпературны рэжым падтрымліваюць належным чынам. Ацяпленне ў камерах не ўключаюць наўмысна, каб чалавек, трапляючы ў кабінет да следчага, "размякаў"...

За час знаходжання за кратамі я стаў горш чуць і бачыць, страціў зубы... Ці гэта не катаванне людзей?

— Аляксандр, ці праўда тое, што вы збіраецеся бліжэйшым часам з'ехаць з Беларусі?

— Так, гэта праўда, бо ў Беларусі я не адчуваю сябе ў бяспецы. Больш за тое, я збіраюся змяніць грамадзянства, бо не жадаю быць грамадзянінам гэтай дзяржавы. Таму што чалавек, які мае на руках даведку аб вызваленні, у гэтай краіне нават не чалавек трэцяга гатунку. Гэта чалавек па-за катэгорыямі. Таму адзінае для мяне выйсце — гэта з'ехаць адсюль. Чым буду займацца? Журналістам не буду, хутчэй за ўсё абяру пісьменніцкі шлях.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ПРЯМАЯ РЕЧЬ

Александр КОЗУЛИН:

«Если народу я нужен живой, он должен для этого что-то делать»

Как известно, экс-кандидата в президенты Александра Козулина отпустили из колонии на три дня на похороны любимой жены Ирины.

Когда я встретилась с ним, он выглядел бодро, энергично и мужественно — настолько, насколько возможно в такой ситуации. Глядя на него, трудно было поверить, что почти два года Александр Козулин находится за решеткой, что 53 дня он голодал, для того чтобы привлечь внимание мировой общественности к ситуации в Беларуси.

Занимаясь организацией похорон жены, Александр Владиславович смог дать интервью "Народной воле".

— Александр Владиславович, примите наши искренние соболезнования и извинения, что в этот трагический момент мы обращаемся к вам с просьбой ответить на некоторые вопросы "Народной воли". Чтобы развеять всевозможные слухи, хотелось бы узнать, что на самом деле происходило в колонии, когда вам сообщили страшную весть о смерти Ирины Ивановны? В СМИ вбрасывалась информация, что якобы в понедельник, 25 февраля, вы отказывались выходить из колонии? Может быть, вам предлагали подписать неприемлемые документы или вообще ничего подобного не было?

— О смерти моей жены мне сообщили 24 февраля в 7 утра. Как только я узнал, что меня не отпускают, тут же объявил голодовку. И готов был с 26 февраля голодать всухую, если не будет решен вопрос о том, чтобы меня отпустили из колонии, дали возможность проститься с женой. Я отдавал отчет своим словам. Я должен, обязан был проститься с Ириной и похоронить ее, в ином случае — нас бы похоронили вместе.

Достаточно хорошо изучив меня, все понимали, что это не шутки, что все очень серьезно.

В тот же день я написал заявление на имя начальника колонии, что отказываюсь выполнять все требования режима. Не режима колонии, а скажу прямо — преступного режима власти, который может допускать такие вещи. Я написал, что считаю себя полностью свободным и больше не собираюсь подчиняться чему бы то ни было. Режим, который не считается с законами, который ведет себя аморально, может быть инструментом насилия, но не более того.

В том же заявлении я написал подробно, почему я иду на такие меры. Это был ответ на те оскорбления, унижения моей семьи, которым ее подвергал режим. Я написал, как в 2005 году Александр Лукашенко взялся лично курировать лечение моей жены. Этот шаг тогда наша семья восприняла с чувством глубокого удовлетворения. Подумалось, есть что-то светлое в этом человеке... Лукашенко заявил тогда: война войной, но жизнь и здоровье близких нам дороже. Признаюсь, нам было приятно это слышать. Но наша семья потратила 9 месяцев на то, чтобы решить все вопросы с этой поездкой. В итоге время было упущено, а Германия отказалась лечить Ирину. Через длительное время после консультации в немецкой клинике оттуда пришел ответ с рекомендациями по лечению и припиской, что это лечение можно пройти в Минске... Потом была президентская кампания, мой незаконный арест, обвинение и тюрьма. Жена бросила все и стала меня спасать. Тот момент был решающим... Если бы тогда, в 2005 году, не было потеряно время и был своевременно поставлен диагноз, применены правильные методы лечения, возможно, все было бы по-другому. И, возможно, не было того, что есть сейчас...

Но даже в этой ситуации перед светлой памятью моей жены я готов был подняться над личным и сесть за стол переговоров. Лукашенко пора задуматься о вечном, пора прекратить тотальное насилие не только надо мной, над людьми, над народом. Пора прекратить террор, который господствует в стране.

— Вы написали это заявление в воскресенье утром. Как думаете, почему так долго принималось решение, отпускать вас или не отпускать на похороны жены?

— В каждом поступке проявляется сущность человека. Часто она бывает завуалирована, часто мы осознанно пытаемся ее завуалировать. Но возникают ситуации, когда эта сущность проявляется в полной мере. Можно издеваться над живыми, но издеваться над мертвыми невозможно. Можно издеваться над чем угодно, но издеваться над святыми понятиями нельзя. Есть вечные понятия, которые должны быть непререкаемы для каждого человека, кем бы он ни был, преступником или президентом. Ситуация вокруг моей семьи зашла слишком далеко. Лукашенко переступил через все, что можно было переступить. Когда я посмотрел по телевизору его выступление в Витебске, я окаменел. Я ужаснулся, до какой низости дошел этот человек, ужаснулся от того, до какого уровня морально-нравственного падения он может дойти. В тот момент оголилась вся его сущность. Он говорил это в ярости, им двигали эмоции. Сущность Лукашенко проявляется, когда он говорит на эмоциональном уровне. Когда эмоции уходят, он становится искушенным политиком. А в тот момент он раскрылся. И все увидели, что он мстит мне за то, что я отказался от лестного, в его понимании, предложения. И в конечном итоге спутал все его карты...

Я не знаю, о чем он думал, когда тело моей жены вторые сутки лежало в морге, а меня не отпускали на похороны... Как можно было к этому относиться?! На что можно было ссылаться?! А дальше что? Хоронить меня вместе с женой?

— Некоторые эксперты и даже бывшие политзаключенные (в частности, Андрей Климов) считают, что Александр Лукашенко остается политическим игроком на европейском поле, он "не лишен каких-то моральных качеств"...

— Все моральные принципы Лукашенко проявятся в дальнейшем отношении к моей семье. И это мы скоро увидим. А что касается Лукашенко-политика, то очевидно, что политик он искушенный. Очевидно, что если он сможет сделать правильные выводы, сесть за стол переговоров, то на какое-то время еще сможет остаться на политическом поле. А если не сделает, то он просто обречен.

— Вечером 25 февраля на центральный проспект Минска вышли сотни людей почтить память Ирины Ивановны. В этот трогательный момент к журналистам "Народной воли" подошел человек, как нам показалось, представитель белорусских спецслужб, и стал намекать, что, мол, у Козулина пошатнулось психическое здоровье. Не первые ли это ласточки того, что власть начнет вбрасывать в массы подобную информацию с целью вашей дискредитации?

— С психическим здоровьем похуже у всех остальных, и пусть они подумают о самих себе. А распускать слухи обо мне не надо, у меня с психикой все нормально... (*И в этом убедились все, кто имел возможность встретиться с Александром Владиславовичем в последние дни* — **Авт.**).

— Александр Владиславович, как вы держитесь? После каждого свидания с дочерями из колонии приходили тревожные новости: вас прессингуют, вам ни за что объявляют дисциплинарные взыскания...

— Меня сломить невозможно. Во мне есть та сила, которая им неведома и непонятна. Они привыкли к тому, что людей можно сломить физически, уничтожить морально, подавить психически. Со мной это не проходит. Во мне есть духовная сила, которой нет у них. Только действуя на пределе человеческих сил и жертвуя многим, можно добиваться результата.

— В свое время и Виктор Гончар, и Геннадий Карпенко, и Юрий Захаренко тоже были готовы на большие жертвы ради лучшего будущего своей страны. Но не кажется ли вам, что Беларуси теперь, как никогда, нужны не жертвы, а люди, способные действовать? Александр Владиславович, может быть, не стоит идти на кардинальные, опасные для здоровья меры?

— Благодаря Гончару, Карпенко, Захаренко я жив. А не идти на жертвы я не могу, я отдам свою жизнь за народ и страну без раздумий. А если народу я нужен живой, он должен для этого что-то делать. И вопрос не только во мне. Мы все время пытаемся себя оправдать, боимся потерять работу, какие-то материальные блага, но при этом забываем, что теряем самое главное — свою совесть.

— Наверняка в колонии у вас было достаточно времени для того, чтобы проанализировать, в чем причины тотальных поражений белорусских демократов. Что они должны противопоставить власти?

— Проблема в том, что они бьются лично за себя, а надо биться за страну и народ. Надо подниматься над личным и отдавать все ради общего блага. Тогда придет успех. Играть в политику невозможно, потому что это сразу видно... И нужно всегда идти до конца. Если ты дрогнул, сломался чуть-чуть, значит, стал на колени. Мне могут отрубить ноги, но я все равно буду стоять.

— Кое-кто считает, что многие люди во власти вас опасаются, потому что сейчас у вас достаточно поводов для мести. Что бы вы ответили на подобные заявления?

— Я никогда не опущусь так низко. Я всегда смогу понять людей, что бы они ни совершили, что бы они ни сделали. Главное, чтобы они это понимали.

— Надеетесь ли вы на окончательное освобождение, тем более что этого требуют Евросоюз и США?

— Мое окончательное освобождение из колонии — это вопрос не личности Козулина, это вопрос решения проблемы цивилизованным путем, вопрос того, что победит: добро или зло, мрак или свет.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

На Магілёўшчыне падаткі павышаны

Сесія Магілёўскага аблсавета дэпутатаў зацвердзіла павелічэнне стаўкі адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў на 30%.

Павелічэнне падатковага цяжару адбываецца насуперак пастановам ураду Беларусі пра яго зніжэнне і прынятай праграме па зніжэнні падатковага цяжару.

У інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Магілёўскай вобласці гэтае павышэнне называюць нязначным. Прадпрымальнікі ж прадракаюць пагаршэнне ўмоў існавання малога бізнесу на Магілёўшчыне.

ВЫБАРЫ

Ультыматум дэмакратаў

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы Беларусі (АДС) рыхтуюцца да ўдзелу ў кампаніі па выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў 2008 г.

Аднак Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы канстатуюць, што ў Рэспубліцы Беларусь не спыняюцца пераследы грамадзян за іх палітычныя перакананні, працягваюцца раптоўныя і неабгрунтаваныя ператрусы і арышты дэмакратычных актывістаў, павялічваецца колькасць палітычных вязняў, няма свабоды атрымання інфармацыі і ўмоў для свабоднага выдання і распаўсюджвання незалежных СМІ, свабоды шэсцяў, мітынгаў і дэманстрацый, свабоды асацыяцый і свабоды сумлення, а вяршэнства закона падменена самаўпраўствам выканаўчай і судовай улад.

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы лічаць, што вынікі выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь могуць быць прызнаныя ўнутры краіны і міжнароднай супольнасцю толькі ў выпадку захавання асноўных міжнародных крытэрыяў, якія вызначаюць дэмакратычнасць выбараў. Яшчэ ў 1999 годзе гэтыя крытэрыі былі прапанаваны для Беларусі Еўрапейскім парламентам, Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы, Парламенцкай асамблеяй Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. У 2006 г. Еўрапейскі Саюз прапанаваў Беларусі шлях да дэмакратызацыі і супрацоўніцтва, выкладзены ў вядомых 12 пунктах, уключна з палажэннямі аб дэмакратызацыі выбараў і спыненні палітычнага пераследу.

На сёння беларускае кіраўніцтва не зрабіла ніякіх крокаў у гэтым кірунку.

Выходзячы з гэтага, Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы патрабуюць ад дзяржавы выканання наступных мінімальных умоў:

— неадкладнага спынення пераследу палітычных апанентаў і вызвалення палітычных вязняў;

— уключэння прадстаўнікоў АДС у склад выбарчых камісій усіх узроўняў, а таксама рэгістрацыі назіральнікаў за выбарамі ад АДС;

— рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты ад АДС.

Гэтыя ўмовы павінны быць падмацаваныя законна абгрунтаванымі патрабаваннямі:

— выключэннем адміністрацыйнага ціску на кандыдатаў у дэпутаты ад АДС, чальцоў ініцыятыўных груп, а таксама выбаршчыкаў, якія паставілі свае подпісы за вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты ад АДС;

— забеспячэннем свабоды і роўнасці ў перадвыбарнай агітацыі;

— адсутнасцю цэнзуры агітацыйных друкаваных матэрыялаў кандыдатаў у дэпутаты ад АДС і тэкстаў іх выступаў па радыё і тэлебачанні;

— выключэннем прымусу грамадзян да датэрміновага галасавання;

— забеспячэннем назіральнікам магчымасці назіраць працэс падліку галасоў чальцамі ўчастковых выбарчых камісій і вызначэння вынікаў выбараў, прадстаўнікам кандыдатаў і назіральнікам — магчымасці атрымліваць копіі пратаколаў выбарчых камісій.

Выкананне гэтых умоў надасць выбарчаму працэсу дэмакратычны характар і паменшыць небяспеку палітычнага крызісу ў краіне.

У выпадку незахавання названых умоў выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу не могуць лічыцца празрыстымі, раўнапраўнымі і справядлівымі, а іх вынікі не могуць быць прызнаныя. Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы гатовы пачаць перамовы з уладамі з мэтай стварыць умовы для прызнання выбараў свабоднымі і справядлівымі як беларускім грамадствам, так і міжнароднай супольнасцю, і патрабуюць распачаць гэтыя перамовы не пазней за 25 красавіка сёлета.

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы будуць весці сталы маніторынг выбарчай кампаніі на прадмет яе адпаведнасці вышэйназваным умовам. Калі дэмакратычныя ўмовы не будуць выконвацца, падчас кампаніі, кандыдаты і актывісты АДС надалей будуць весці інфармацыйна-мабілізацыйную працу з мэтай наладзіць масавыя акцыі супраць фальсіфікацыі выбараў, а таксама пакідаюць за сабою права прадпрымаць іншыя дзеянні, адэкватныя сітуацыі.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЛЮТАГА 2008 г.

ПРОТЕСТ

Как у нас судят

19 октября 2006 года на страницах "Народной воли" в статье "В крутом пике" я, бывший пилот самолета ТУ-154, сказал, в частности, что *"положение дел в единственной белорусской государственной авиакомпании "Белавиа" и его вышестоящей структуре Госкомавиации (ныне Департамент по авиации) вызывает не только тревогу, но и обоснованное опасение за жизнь и здоровье граждан Беларуси, пользующихся услугами национальной авиакомпании".*

Казалось бы, что тут такого. Человек имеет право на свое мнение, на свой взгляд, касающийся ситуации в той или иной отрасли, и тут нет ничего противоестественного. Но...

Генеральный директор авиакомпании "Белавиа" А.Н.Гусаров подает в суд иск к автору и газете о защите деловой репутации и требует признать не соответствующей действительности информацию, содержащуюся в приведенной выше фразе.

Дело в суде Октябрьского района г.Минска рассматривала судья И.В.Басько, которая полностью отказала в иске "Белавиа".

Свое решение судья, основываясь на постановлении Пленума Верховного суда, мотивировала тем, что не могут признаваться обоснованными требования об опровержении сведений, содержащих соответствующую действительности критику недостатков в работе.

Доводы автора статьи, изложенные в ходе судебного заседания, были признаны соответствующими действительности и подтверждены документально ответами из проверяющих деятельность "Белавиа" органов — Минской и Белорусской транспортной прокуратуры и других.

В частности, в одном из представлений прокуратуры указывалось, что *"многочисленные обращения работников гражданской авиации в Белорусскую транспортную прокуратуру по нарушениям трудового законодательства нашли свое подтверждение, обоснованны и вызывают серьезную обеспокоенность. Со стороны руководства предприятия усматривается не только приниженный контроль за работой среднего звена, но и формальный подход к устранению недостатков и исполнению законных требований прокуратуры".*

При этом одним из пунктов резолютивной части ответа прокуратуры директору Департамента предлагалось привлечь к ответственности должностных лиц "Белавиа", допустивших нарушение законодательства.

Аналогичные представления выносились и ранее.

Из ответа директора Департамента по авиации В.Г.Мельника в адрес Белорусской транспортной прокуратуры: *"За допущенные нарушения генеральному директору РУП "Национальная компания "Белавиа" Гусарову А.Н. объявлен выговор (приказ Минтранса от 20.02.07 г. №12л)... начальнику АТБ "Белавиа" Ремденку С.О. ...объявлен выговор (приказ от 01.02.07 г. №3/д)... руководителям структурных подразделений строго указано на неукоснительное соблюдение законодательства".* Подвергнут административному штрафу гендиректор "Белавиа" А.Н.Гусаров в размере 5 базовых величин.

Также в решении судьи И.В.Басько приводились и другие документально подтвержденные основания о нарушениях в "Белавиа", которые связаны с безопасностью полетов, к примеру, когда не соблюдались требования Наставления по производству полетов и Положения о рабочем времени и времени отдыха летного состава.

В суде выступили свидетели — бывшие авиаспециалисты "Белавиа", подтвердившие факты нарушений, непосредственно связанных с безопасностью выполнения полетов.

В соответствии со ст. 33 Конституции Республики Беларусь *"каждому гарантируется свобода мнений, убеждений и их свободное выражение. Никто не может быть принужден к выражению своих убеждений или отказу от них".*

Это также было отражено в решении судьи И.В.Басько. По мнению суда, выражение автором своего личного мнения не может быть истинным или ложным, не может соответствовать или не соответствовать действительности, а поэтому не могут быть опровергнуты по решению суда, а могут оспариваться в порядке полемики в этом же средстве массовой информации, к чему и призывала газета "Народная воля".

Но начальство "Белавиа" избрало другой путь. Не согласившись с законным решением суда, оно подало кассационную жалобу. В результате решение было отменено, а коллегия Мингорсуда в составе О.С.Будовской, О.Е.Антоненко, Е.В.Леонович дала пояснение, что выраженное в статье мнение гражданина должно быть документально подтверждено.

Именно поэтому при повторном рассмотрении в суде Октябрьского р-на иска "Белавиа" было заявлено ходатайство об истребовании материалов уголовного дела в отношении бывшего первого заместителя генерального директора "Белавиа" А.Н.Подлуцкого, с 2006 года отбывающего десятилетний тюремный срок по ст.430 ч.3 УК РБ, пяти томов расследований из Белорусской транспортной прокуратуры, шесть томов уголовного дела в отношении должностного лица "Белавиа" А.М.Трофимова, материалов отказного производства по фактам заражения самолета "Белавиа" особо токсичным ядовитым веществом — ртутью и других.

Рассматривавшая дело судья Н.Н.Песенко своеобразно отнеслась к обеспокоенности и тревоге автора статьи, не приняв во внимание ни один из документов в опровержение исковых требований "Белавиа". Было вынесено решение, которым удовлетворены исковые требования, сохранив деловую репутацию "Белавиа" непоколебимой и обязав "Народную волю" опубликовать резолютивную часть суда об опровержении на том же месте полосы газеты.

Видимо, в одном из номеров по требованию суда и будет опубликовано такое опровержение. Но прежде чем сделать это, прошу вас, уважаемые читатели, самим сделать вывод о том, безукоризненна ли деловая репутация единственной белорусской авиакомпании "Белавиа", стоит ли доверять свою жизнь и здоровье тем, кто сам нарушает законы страны и требования к безопасности полетов.

Это особенно актуально после недавнего крушения самолета CRJ-100 авиакомпании "Белавиа" в Ереване 14 февраля с.г. с пассажирами на борту, которые только чудом остались живы.

Но у суда даже и мысли не возникло о том, что тревога работников "Белавиа" и простых граждан за жизнь и здоровье обоснованна. Об этом открыто заявлялось в многократных обращениях и жалобах в отношении "Белавиа" в вышестоящий орган.

Приведу несколько строк из материалов уголовного дела №06029150028 (том 6 л.д. 114) за подписью заместителя транспортной прокуратуры В.А.Реутского: *"В результате бездействия Трофимова А.М. члены экипажей воздушных судов 371 раз прибывали в Москву для прохождения тренажерной подготовки и через 55 минут выбывали обратно в Минск, не пройдя тренажерной подготовки и в дальнейшем незаконно были допущены к полетам на воздушных судах "Белавиа", чем причинен существенный вред государственным интересам в безопасности полетов".*

Из акта ревизии "Белавиа" (т.4 данного уголовного дела): *"За период с 18.02.04 по 1.05.06 члены экипажей по причине непрохождения тренировки на тренажере от полетов не отстранялись...", хотя "лица, не прошедшие тренировку в установленные сроки, теряют право на дальнейшее выполнение полетов до прохождения соответствующей тренировки..." "Все лица летного состава независимо от должности обязаны проходить тренировку на тренажере в объеме не менее 3 часов в полугодие. Тренажерная подготовка является одним из основных видов подготовки экипажей к действиям в особых случаях и аварийных ситуациях".*

Приказом по авиакомпании "Белавиа" от 17.05.06 г. №122 была создана комиссия по расследованию нарушений законодательства по вопросам обеспечения безопасности полетов, 25 авиаспециалистов были отстранены от выполнения полетов.

Разве это не факт, явно свидетельствующий о нарушениях безопасности полетов в "Белавиа", когда не прошедшие необходимую специальную подготовку летные экипажи в 371 случае (за 2 года) были незаконно допущены к выполнению полетов и перевозили белорусских и иностранных граждан, а также выполняли литерные рейсы, не имея права на управление самолетом?

Такое, к сожалению, в "Белавиа" оказалось возможным.

Но в чем виноваты люди, пользующиеся ее услугами и надеющиеся на то, что безопасность полетов в этой единственной авиакомпании на высоте?

Приведу другой, не менее ужасающий факт, когда 12 мая 2004 года в самолете "Белавиа" №85538 при проведении технического обслуживания под полом была обнаружена свободно плавающая ртуть. При первичном отборе проб после уборки ртути превышение ее паров на самолете было в 32,7 раза выше предельно допустимых концентраций. Даже в техническом классе АТБ "Белавиа" (там находится и раздевалка авиатехсостава, обслуживающего самолет) превышение паров ртути превысило ПДК в 7,2 раза.

Ст.лейтенант милиции П.А.Марсов информировал начальника ОВД на воздушном транспорте, что в результате эксплуатации воздушного судна были нарушены правила перевозки сильнодействующих и ядовитых веществ.

В материалах отказного производства (определить причинителя вреда не удалось) имеются письменные показания врача Л.А.Ереминой о том, что *"степень угрозы здоровью зависит от длительности пребывания. Возможный ущерб здоровью должен быть определен медицинскими исследованиями организма (пары ртути являются ядом для центральной нервной системы). Возможность использования воздушного судна в дальнейшей эксплуатации устанавливает врач коммунальной гигиены ЦГиЭ Октябрьского р-на".* Выполнение полетов на данном воздушном судне было временно остановлено врачами из-за опасности для здоровья людей.

Из объяснения заведующей отделением гигиены труда ЦГиЭ Октябрьского района: *"В связи с тем, что обнаружено значительное превышение предельно допустимых концентраций ртути, существует угроза состоянию здоровья людей, участвовавших в обслуживании самолета, его эксплуатировавших, и пассажиров в частности. В результате накопления ртути в организме возможно поражение ЦНС, нарушение обмена веществ, нарушение функций внутренних органов..."*

При этом ни один из более 300 пассажиров, пользовавшихся услугами "Белавиа", при выполнении рейса Минск-Анталия—Минск только 11 мая 2004 года, даже не был извещен об этом, обследования не проходил, как, впрочем, некоторые из авиаспециалистов "Белавиа", которые узнали о наличии приказа о прохождении медобследования на наличие ртути в организме только спустя почти год.

Самолет с ртутью летал с белорусскими экипажами и бригадами авиатехсостава за границей с 2001-го по 2004 год, и в какой период произошло загрязнение, так и не установлено. Но факт остается фактом.

Опасно ли дышать парами ртути в самолетах "Белавиа"? Судя по решению суда — нет.

Опасно ли летать на самолетах "Белавиа" с неподготовленными экипажами, не прошедшими по всем требованиям тренажерной подготовки, где иногда места пилотов занимают бывшие штурманы, переученные в "Белавиа" на пилотов?

Читатели сами ответят на этот и другие вопросы, я же скажу: в самолете, потерпевшем крушение в Ереване, на месте второго пилота находился бывший штурман "Белавиа" А.Мухин.

До выводов комиссии рано говорить о причинах этой аварии, после которой семь человек попали в больницу, а самолет восстановлению не подлежит, но то, что в "Белавиа" нарушена безопасность полетов, очевидно из фотографий в средствах массовой информации, телерепортажей с места трагедии.

Фактов, в том числе и подтвержденных документально, можно приводить еще много. И мне абсолютно непонятно, почему коллегия Минского городского суда, уже в составе О.Антоненко, Н.Жупиковой, Е.Леонович, отменила, на мой взгляд, абсолютно законное, абсолютно грамотное решение судьи Октябрьского суда И.В.Басько. Как и то, почему судья этого же суда Н.Н.Песенко, не приняв во внимание ряд подтвержденных документами фактов, вынесла противоположное решение. Может, председатель Мингорсуда М.Ардяко и Верховный суд во главе с В.Сукало скажут, наконец, справедливое слово.

Олег БАКУЛИН,
бывший пилот самолета ТУ-154 авиакомпании "Белавиа".

ПАДЛІЧЫЛІ...

Падвоенае і патроенае шчасце

Абсалютны рэкорд за апошнія два дзесяцігоддзі ўсталяваны летась у Беларусі па двойнях, тройнях і чацвярнях.

Паводле папярэдніх звестак, у 2007 годзе зафіксавана 965 выпадкаў нараджэння двайнятаў, 20 — трайнятаў і 1 — чацвярні. Апошні выпадак адбыўся ў Мінску, а першая чацвярня ў Беларусі з'явілася на свет у 2004 годзе і таксама ў сталіцы.

Навабранцы

Каля 1,5 тысячы ўхілістаў зафіксавана ў Беларусі па выніках восеньска-зімовай прызыўной кампаніі на тэрміновую вайсковую службу.

Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве абароны Беларусі. У асноўным гэта тыя, хто знаходзіцца на вучобе або на працы за мяжой, а таксама злосныя ўхілісты, адзначылі ў міністэрстве. Афіцыйную адтэрміноўку атрымалі амаль 75 тысяч маладзёнаў. А ў войска патрапілі каля 10 тысяч чалавек.

СТРАТЫ

Смуткуем

У лясным масіве недалёка ад вуліцы Паркавая ў пасёлку Ждановічы Мінскага раёна знойдзены павешаным карэспандэнт "Комсомольской правды" в Белоруссии" **Вячаслаў Ткач**, які добра вядомы чытачам газеты сваімі тэкстамі на крымінальную тэматыку.

Пра гэта паведаміў старшы следчы пракуратуры Мінскага раёна Аляксандр Філонаў. Паводле яго слоў, слядоў барацьбы або таго, што ў дачыненні да Ткача было ўчынена злачынства, не выяўлена.

Ёсць некалькі версій трагедыі, але галоўная — самазабойства на сямейна-бытавой глебе.

ЗАКУЛІССЕ

Таемныя сустрэчы міністра Мартынава ў Германіі

Як паведамілі нямецкія палітолагі, нядаўна афіцыйны Мінск зрабіў неафіцыйны сігнал Берліну і Бруселю. Паводле слоў прадстаўнікоў Германіі, нядаўна адбылася сустрэча міністра замежных спраў Беларусі Сяргея Мартынава з кіраўніцтвам нямецкага МЗС. Эксперты расцэньваюць сустрэчу "як знак гатоўнасці Беларусі да дыялогу з Еўрасаюзам".

Паведамляецца, што на берлінскія перамовы беларускі міністр прыбыў з Мюнхена пасля заканчэння 44-й міжнароднай канферэнцыі па пытаннях палітыкі бяспекі. Нягледзячы на ўдзел у перамовах высокага кіраўніцтва знешнепалітычных ведамстваў Германіі і Беларусі, пра візіт міністра Мартынава ў Берлін няма ніякіх афіцыйных звестак як з нямецкага, так і з беларускага боку. Крыніца ў нямецкім МЗС нават на ўмовах ананімнасці пагадзілася толькі пацвердзіць сам факт сустрэчы.

Эксперт Нямецкага савета па знешняй палітыцы Аляксандр Рар у размове з Радыё Свабода таксама быў нешматслоўны. *"Я магу толькі сказаць, што сустрэча адбылася з цэлай групай нямецкіх дэпутатаў і вышэйшых прадстаўнікоў нямецкага МЗС. На ёй у вельмі адкрытай размове і вельмі жорсткім тонам як з таго, так і з іншага боку, аднак вельмі шчыра і з даверам было праартыкулявана пра шляхі збліжэння Еўрапейскага Саюза з Беларуссю",* — кажа нямецкі палітолаг.

Дэпутат Бундэстага і Еўрапарламента ад партыі "зялёных" Элізабэт Шродтэр патлумачыла скупасць інфармацыі закрытым характарам сустрэчы. *"Паводле існуючых еўрапейскіх правілаў, кантакты на вышэйшым узроўні паміж ЕС і Беларуссю афіцыйна не існуюць, перадусім з тымі асобамі, якія служаць беларускаму рэжыму і адказваюць за цяперашнюю палітычную сітуацыю. Аднак такія кантакты адбываюцца. Неафіцыйныя сустрэчы афіцыйных асоб, якія ніяк не асвятляюцца ў СМІ",* — сцвярджае дэпутат.

Больш змястоўны каментарый да візіту міністра Мартынава ў Берлін дала дэпутат Бундэстага ад сацыял-дэмакратычнай партыі, старшыня падкамітэта ПА АБСЕ па Беларусі Ута Цапф.

Выступаючы на нядаўнім пасяджэнні Бундэстага, яна заявіла, што Мартынаў сказаў: "It takes two to tango" ("каб станцаваць танга, трэба двое"). Так, сапраўды. Аднак тое, што цяпер назіраецца паміж еўрапейскімі краінамі і Беларуссю, нагадвае хутчэй ча-ча-ча ці нейкія скокі *(Смяецца.)*".

Паводле меркавання спадарыні Цапф, Беларусь аналізуе свае праблемы. У сувязі з цяперашняй сітуацыяй з расійскімі энэргапастаўкамі краіна "эканамічна зацікаўлена ва ўмацаванні стасункаў з Еўропай".

"Аднак толькі дэмакратычныя рэформы ў гэтай краіне змогуць стварыць сапраўдныя падставы для супрацоўніцтва з Еўропай, для паляпшэння ўзроўню жыцця насельніцтва і да выйсця са стану ізаляцыі, у якую Беларусь сама ж сябе загнала", — падкрэсліла нямецкая сацыял-дэмакратка.

У беларускім МЗС берлінскую сустрэчу ніяк не каментуюць.

Дыктоўку — талакой

Паважаныя прыхільнікі першай агульнанацыянальнай дыктоўкі! Аргкамітэт вырашыў зрабіць тэкст першай дыктоўкі талакой разам з вамі — удзельнікамі і нашымі пісьменнікамі.

Спецыялісты па дыктантах лічаць, што тэкст для дыктоўкі мусіць быць зроблены з асобных выказванняў — нарэзак з тэкстаў. Хто жадае ўзяць удзел у падрыхтоўцы ўзорнага тэксту, можа прачытаць новыя ці перачытаць класічныя творы, выпісаць абзацы пра Незалежнасць, Родную Мову, Гістарычную спадчыну... і даслаць нам.

Спецыялісты па вытворчасці дыктовак ужо працуюць. Прапановы, якія не трапяць у тэкст першай дыктоўкі, абавязкова будуць выкарыстаны ў наступных.

Спадзяемся, што незалежныя газеты будуць друкаваць вашы нарэзкі для дыктовак альбо цэлыя тэксты.

Рабочая назва ўзорнага тэксту запазычана ва Уладзіміра Арлова "Незалежнасьць — гэта...".

Ёсць і яшчэ адна прапанова. Калі пойдзеце на дыктоўку 25 сакавіка, захапіце з сабой кнігу любімага пісьменніка. Хай яна ляжыць перад вамі, калі будзеце пісаць. На фотаздымку з дыктоўкі разам з вамі і вашымі дзецьмі застанецца на памяць і ваша любімая кніга.

Давайце зладзім і напішам дыктоўку талакой.

Прапановы нарэзак дасылайце на адрас:

Мінск, вул. Румянцава, 13, ТБМ (ГА "Таварыства беларускай мовы"), з паметкай "Першая агульнанацыянальная дыктоўка".

З павагаю і пашанаю да прыхільнікаў Роднай Мовы ад імя аргкамітэта —

Уладзімір ПАДГОЛ, дацэнт.

ЗНАХОДКА

Ладдзя з XII стагоддзя

Унікальная шахматная фігура - ладдзя, скрадзеная ў жніўні 2004 года з Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, вернута дзяржаве.

Пра гэта паведамілі ў прэс-службе ўпраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці. "Чэкісты" затрымалі 21-гадовага жыхара Гродна пры спробе продажу рарытэта, які той ацаніў у 2 мільёны рублёў.

Менавіта такую суму малады чалавек жадаў атрымаць за бясцэнны экспанат часоў Полацкага княства. Дзесяткі гадоў ладдзя XII стагоддзя лічылася знакам музея, упрыгожваючы экспазіцыю старажытнасці.

Матэрыялы затрымання перададзены ў Ленінскі раённы аддзел унутраных спраў Гродна для далейшых следчых дзеянняў.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Ці ёсць у дэпутатаў сакрэты ад выбаршчыкаў?

Група брэсцкіх выбаршчыкаў накіравала ліст старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу з просьбай праінфармаваць іх аб узроўні заработнай платы дэпутатаў.

Як паведаміў БелаПАН адзін з аўтараў ліста, намеснік старшыні абласной арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі Мікалай Коўш, у лістападзе 2007 года ў Брэсце адбыліся сустрэчы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Алега Вялічкі, Святланы Гіль і Валянціны Качан з выбаршчыкамі. Большая частка пытанняў, зададзеных жыхарамі горада, тычылася адмены сацыяльных гарантый, росту цэн, асабліва на прадукты харчавання, інфляцыі, павышэння тарыфаў ЖКГ.

"Выбаршчыкаў, якія не ведаюць, як звесці канцы з канцамі, цікавіла, колькі ж самі парламентарыі атрымліваюць за сваю працу. Адказы дэпутатаў былі вельмі супярэчлівыя — ад 800 тыс. да 2,5 млн рублёў. Таму мы вырашылі афіцыйна даведацца аб інфармацыі, што нас цікавіць, з першых вуснаў", — зазначыў М.Коўш.

Паводле яго слоў, выбаршчыкі просяць паведаміць звесткі аб сярэднямесячнай зарплаце радавых дэпутатаў, старшыняў камісій, іх намеснікаў, а таксама старшыні Палаты прадстаўнікоў і яго намеснікаў. Ініцыятыўную групу цікавіць таксама, якія дадатковыя выплаты робяцца парламентарыям (да адпачынку, лячэбныя дапамогі і г.д.); кім аплачваецца жыллё, праезд дэпутатаў; як разлічваецца пенсія парламентарыяў.

У лісце група выбаршчыкаў — 35 чалавек — спасылаецца на артыкул 34 Канстытуцыі, які, на іх думку, дае права на атрыманне такой інфармацыі.

Ларыса ШЫГАНАВА.

ЖАХ!

Сабака загрыз жанчыну

У Лоеве (Гомельская вобласць) сабака байцоўскай пароды бульмастыф загрыз жанчыну, 1943 года нараджэння. Пра гэта БелаПАН паведамілі ў пракуратуры Лоеўскага раёна, якая праводзіць праверку па гэтым факце. Паводле слоў старшага памочніка пракурора Андрэя Лявончыка, сабака належаў сыну загінуўшай, індывідуальнаму прадпрымальніку, які трымаў яе для аховы тавараў. "У той дзень сын рыхтаваўся да нейкай паездкі, таму сабаку адвёў да маці. Паміж трыма і чатырма гадзінамі ночы суседзі чулі крыкі пенсіянеркі. Калі раніцай прыехаў сын, бульмастыф сядзеў каля жанчыны ў верандзе, зачыненай знутры", — пракаменціраваў А.Лявончык. Паводле слоў памочніка пракурора, прычына смерці пакуль дакладна не ўстаноўлена.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Убийце десятиклассника Павла Гримкова дали девять лет

В суде Первомайского района города Витебска закончился процесс по уголовному делу в отношении Владимира Вальтера и Дмитрия Коновалова. Как сообщала "Народная воля", 27 ноября минувшего года четверо витебских школьников средь бела дня на мосту имени Шмырева были беспричинно жестоко избиты пьяными хулиганами. Один пострадавший — Павел Гримков — от полученных травм скончался на месте побоища в считанные минуты. Павел был единственным ребенком в семье. 19 ноября ему исполнилось 16 лет.

Владимиру Вальтеру предъявлено обвинение в умышленном причинении тяжкого телесного повреждения, совершенного из хулиганских побуждений, повлекшее по неосторожности смерть потерпевшего, и умышленном нарушении общественного порядка. Последняя статья инкриминируется и Дмитрию Коновалову. С момента задержания Вальтер находился под стражей, а Коновалову применена мера пресечения — домашний арест.

В уголовном деле фигурирует "собутыльник" преступников — Юрий Грамузов. Но, как установлено следствием, он не участвовал в избиении школьников, поэтому по делу проходил как свидетель. Хотя некоторые считают, что не мешало бы такого свидетеля привлечь к ответственности за то, что не предотвратил избиение детей.

Судебное разбирательство началось 19 февраля. В небольшом зале не смогли вместиться все желающие. Даже отцу Павла Юрию Леонидовичу Гримкову не нашлось там места. На замечания родственников потерпевших секретарь судебного заседания Жанна Зайцева вопросительно заметила: "Куда я его посажу, на пол, что ли?"

Судья Елена Жук на реплику подчиненной никак не отреагировала. Благодаря вмешательству председателя суда Первомайского района Владимира Бессмертного 20 февраля для заседания уже был предоставлен более просторный зал.

Подсудимый Владимир Вальтер свою вину полностью признал, просил прощения у горем убитых родителей, на которых не было лица... Свидетели — сотрудники милиции, давая показания в суде, говорили, что, дескать, потерпевшие школьники в день трагедии утверждали, что их избивали все трое хулиганов. Но, как уже сказано выше, Вальтер оказался убийцей Павла Гримкова. Именно он нанес школьнику восемь ударов: 3 в голову, 3 в живот, по одному в шею и солнечное сплетение...

Коновалов уверял суд, что дважды приложился кулаком лишь к голове 18-летнего Кости Соданенко. Но среди пострадавших были еще и 15-летний Саша Лосев и 14-летний учащийся Виталий Игнатьев, у которых на теле судмедэксперты зафиксировали множество ушибов и синяков. Кто же еще колотил несчастных школьников? Хулиганы были почти вдвое старше своих жертв, намного здоровее, но, обезумев от алкоголя, били даже лежащих мальчишек ногами. Уже в бездыханное тело Павла пнул ботинком Вальтер.

"Мимо проезжало много машин, — поясняла в суде водитель трамвая Валентина Степанова. — Но никто не пытался предотвратить беду". Кстати, сама Валентина не проехала мимо, а, можно сказать, спасла жизнь остальным школьникам.

В итоге суд приговорил Владимира Вальтера к лишению свободы сроком на 9 лет, а Дмитрию Коновалову дали 4 года с отсрочкой.

"Никакой тюремный срок и никакие деньги не заменят нам Пашу", — со слезами на глазах сказала мать убитого мальчика...

Владимир ЖИГУЛОВ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЛЮТАГА 2008 г.

Самавызначэнне, народжанае ў пакутах

25 сакавіка — 90 год з дня ўтварэння Беларускай Народнай Рэспублікі

Усеагульны сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс, у якім апынулася Расійская імперыя ў час Першай сусветнай вайны, прывёў у 1917 годзе да каласальных рэвалюцыйных катаклізмаў. Звяржэнне самадзяржаўя ў лютым 1917 г. і паскораны гэтым працэс дэзінтэграцыі імперыі аб'ектыўна выносілі на парадак дня праблему дзяржаўна-палітычнага і нацыянальна-культурнага самавызначэння яе шматлікіх народаў. Неабходнасць пастаноўкі такой праблемы і пошуку спосабаў яе вырашэння паўстала і перад беларускім народам. Аднак рэальныя суадносіны сацыяльна-палітычных сіл, што склаліся на тэрыторыі краю за гады вайны, не спрыялі хуткаму ўсведамленню мясцовым насельніцтвам патрэбы нацыянальнага самавызначэння. Беларускім патрыётам-адраджэнцам, большая частка якіх з'яўлялася ў палітыцы пачаткоўцамі, надзвычай складана было адстойваць інтарэсы беларускага народа ва ўмовах, калі ў краі дзейнічалі непараўнальна больш магутныя цэнтралісцкія сілы, а нацыянальная самасвядомасць асноўнага класа беларускай нацыі — сялянства — не вызначалася высокім узроўнем. Беларускі нацыянальны рух увесь час сутыкаўся з вялікімі цяжкасцямі, таму вельмі павольна набываў значэнне ўплывовай палітычнай сілы.

Агульнарасійскія партыі (ліберальныя, народніцкія, сацыял-дэмакратычныя), якія аказвалі ў 1917 годзе вызначальны ўплыў на грамадскае жыццё Беларусі, зыходзілі з прыярытэту вялікадзяржаўных, агульнадэмакратычных альбо класавых інтарэсаў. Нацыянальнае пытанне, як правіла, не мела для іх самадастатковага значэння. Сфарміраваныя ў ходзе рэвалюцыі цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады, саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, а таксама камандаванне і вайсковыя камітэты Заходняга фронту былі індыферэнтныя ці нават варожыя да беларускай ідэі, праводзілі вялікадзяржаўніцкую палітыку. Разам з тым рэвалюцыя стварыла шырокія магчымасці для разгортвання і арганізацыйна-палітычнага афармлення беларускага нацыянальнага руху — асноўнага генератара ідэі самавызначэння. У канцы сакавіка 1917 года ў Менску быў створаны каардынацыйны цэнтр — Беларускі нацыянальны камітэт, заменены ў ліпені Цэнтральнай радай беларускіх арганізацый, якая ў кастрычніку была пераўтворана ў Вялікую Беларускую раду.

Яшчэ адным важным, менавіта геапалітычным фактарам, што зрабіў істотны ўплыў на далейшае развіццё падзей і разгортванне беларускага нацыянальнага руху, была вялікая пагроза таго, што лінія расійска-германскага фронту, якая праходзіла па тэрыторыі Беларусі, можа стаць у бліжэйшай будучыні лініяй падзелу беларускага народа па выніках мірных перагавораў. Так, у рэзалюцыі "Аб нацыянальна-палітычным Адраджэнні Беларусі", прынятай канферэнцыяй воінаў-беларусаў Петраградскага гарнізона, што адбылася 11—14 лістапада 1917 г., адзначалася: "Лёс Беларусі цалкам залежыць ад вынікаў мірных перагавораў. Няма ўпэўненасці ў тым, што акупаваная частка Беларусі будзе ўз'яднаная з астатняю яе часткаю ў выпадку, калі на мірнай канферэнцыі не будзе прадстаўніка беларускага народа". Канферэнцыя воінаў-беларусаў Петраградскага гарнізона прызнала необходным дабівацца такога прадстаўніцтва і звярнулася да Савета Народных Камісараў з патрабаваннем выдаць дэкрэт аб тым, што "расійскі сялянскі і рабочы Урад паставіць адной з умоў заключэння міру аб'яднанне абедзвюх частак Беларусі", падзеленай на той момант лініяй фронту. А для падтрымання "законных, спрадвечных і неад'емных" патрабаванняў беларускага народа ўдзельнікі канферэнцыі заклікалі згуртаваць "усе жывыя сілы беларускага народа вакол Вялікай беларускай рады і Беларускай цэнтральнай вайсковай рады ў г. Мінску".

Менавіта Вялікая Беларуская Рада выступіла ініцыятарам склікання Першага Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 г., дэлегаты якога таксама выказвалі сваё хваляванне за лёс свайго краю. Так, 15 снежня 1917 г. адбылася гутарка старшыні з'езда А.Савіча з народным камісарам па нацыянальных справах урада Савецкай Расіі І.Сталіным. І.Сталін запэўніў дэлегатаў Усебеларускага з'езда ў тым, што пытанне пра далейшы лёс Беларусі не абмяркоўвалася і паабяцаў, што "Савет Народных Камісараў будзе абараняць інтарэсы працоўных мас Беларусі ўсімі сродкамі". Разам з тым адказ І.Сталіна дэлегатамі быў успрыняты з пэўнай насцярогай. Па пытанні пра палітычнае і міжнароднае становішча дэлегаты Першага Усебеларускага з'езда падрыхтавалі рэзалюцыю, паводле якой "Беларускаму Народнаму Савету павінна належаць права абароны інтарэсаў Беларусі пры заключэнні міру". У пачатку 2-й гадзіны ночы 18 снежня 1917 года была абвешчана выніковая пастанова з'езда, паводле якой: "Замацоўваючы сваё права на самавызначэнне, абвешчанае Расійскай рэвалюцыяй, і сцвярджаючы дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі, для выратавання роднага краю і засцярогі яго ад падзелу і адрыву ад Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі, І Усебеларускі з'езд пастанаўляе: неадкладна ўтварыць са свайго складу орган краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання краем, уступаючы ў справавыя дачыненні з цэнтральнай уладай, адказнай перад Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў". Такім чынам, адлюстроўваючы настроі, безумоўна, пераважнай бальшыні тагачаснага беларускага грамадства, з'езд не дапускаў магчымасці існавання Беларусі па-за межамі агульнарасійскай, "постімперскай" геапалітычнай прасторы. Думка пра ўваходжанне Беларусі ў міжнародную супольнасць (сусветную, еўрапейскую) без пасярэдніцтва Расіі яшчэ не ўкладвалася ва ўяўленне пераважнай часткі беларускай палітычнай эліты ўзору 1917 года. Разам з тым Усебеларускі з'езд зафіксаваў важны зрух у яе грамадскай свядомасці: Беларусь хоць і ўяўлялася па-ранейшаму толькі звяном больш шырокага дзяржаўна-палітычнага аб'яднання, але ўжо не як безаблічная, жорстка падпарадкаваная цэнтру правінцыя, а як параўнаўча самастойны, раўнапраўны, з уласнымі інтарэсамі і аўтаномнай сістэмай кіравання суб'ект агульнарасійскага супольніцтва народаў і краёў. Такі статус мог паслужыць стартавай пляцоўкай для будучага руху да поўнага суверэнітэту. Разам з тым Усебеларускі з'езд, насуперак сцвярджэнням савецкай гістарыяграфіі пра нібыта ажыццёўленую ім спробу "ўзурпацыі ўлады", зусім не прэтэндаваў на беспаваротнае замацаванне ўлады за сабой і вылучаным са свайго складу органам. Наадварот, апошні разглядаўся толькі як часовы; галоўным яго заданнем вызначалася найхутчэйшае скліканне Беларускага Устаноўчага сходу, які быў закліканы прыняць канчатковую пастанову аб самавызначэнні Беларусі і сфарміраваць пастаянныя органы ўлады. Гэта быў дэмакратычны негвалтоўны, цывілізаваны шлях. Такі шлях, між іншым, даваў немалыя шансы доступу да краёвай улады і бальшавікам, паколькі яны (як паказалі выбары ва Усерасійскі Устаноўчы сход) карысталіся на той момант значным рэйтынгам сярод мясцовага насельніцтва. Так што і ў гэтым плане адкрывалася прастора для кампрамісаў. Разам з тым, як адзначыў І.М. Ігнаценка, бальшавікі лічылі, што толькі іх думка мела права на жыццё, кампраміс у іх разуменні — гэта ўступка толькі процілеглага боку.

Таму, нягледзячы на тое, што 17 снежня 1917 года (ст. ст.) быў прыняты Зварот Народнага Камісарыята Замежных спраў Савецкай Расіі да народаў і ўрадаў саюзных краін, якім адзначалася, што "Руская рэвалюцыя прадставіла гэта права (на самавызначэнне) народам Фінляндыі, Украіны, Беларусі і г.д. Відавочна, што патрабаваць самавызначэння для народаў, якія знаходзяцца ў межах варожых дзяржаў, і адмаўляць у самавызначэнні народам уласнай дзяржавы або ўласных калоній азначала б бараніць праграму самага непрыкрытага, самага цынічнага імперыялізму", позняй ноччу з 17 на 18 снежня 1917 года ўзброенымі салдатамі на чале з начальнікам Мінскага гарнізона М.Крывашэіным і членам СНК Заходняй вобласці і фронту Л.Рэзаўскім праца І Усебеларускага з'езда была гвалтоўна спынена, прэзідыум і некаторыя дэлегаты арыштаваныя.

Разгон Усебеларускага з'езда сарваў натуральны, легітымны, найбольш паўнавартасны шлях ператварэння беларусаў з аморфнай этнічнай масы ў сучасную палітычную нацыю. Стаўшы вяршыняй усяго папярэдняга развіцця беларускага нацыянальнага руху, Усебеларускі з'езд, які сабраў 1872 дэлегаты, з'явіўся першым у гісторыі прадстаўнічым форумам усёй беларускай этнасацыяльнай супольнасці. Ён быў своеасаблівай жывой мадэллю гэтай супольнасці — з усімі яе моцнымі і слабымі бакамі. З'езд канчаткова сцвердзіў факт існавання беларускага народа, засведчыў пачатак усведамлення ім сваіх палітычных інтарэсаў. Пасля з'езда ігнараваць беларускае пытанне ўжо стала практычна немагчыма. Неабходна адзначыць, што з'езд, як выказнік інтарэсаў палітычна актыўнай часткі беларускага народа, меў найвышэйшую ва ўмовах таго часу ступень легітымнасці. Законна створаныя ім органы: Савет (Рада) з'езда і Выканаўчы камітэт Рады з'езда мелі права прымаць абсалютна легітымныя рашэнні па пытаннях, што датычыліся лёсу Беларусі і яе народа.

Гістарычныя падзеі канца 1917 г. — пачатку 1918 г., а менавіта — абвяшчэнне незалежнасці Украінскай Народнай Рэспублікі ў студзені 1918 г. і абвяшчэнне 16 лютага 1918-га Дэкларацыі незалежнасці Летувіскай дзяржавы з іх прэтэнзіямі на беларускія тэрыторыі, акупацыя немцамі ў лютым 1918 г. большай часткі Беларусі, падпісанне ў Брэст-Літоўску сепаратнай савецка-германскай дамовы пры поўным ігнараванні беларускіх інтарэсаў — яшчэ пільней патрабавалі, каб перад сусветнай грамадскасцю было прадэманстравана, што гэтая зямля мае законнага гаспадара — самабытны беларускі народ, які жыве тут спрадвеку.

Як сведчылі ўмовы мірнага дагавора, Германскі ўрад, як, дарэчы, і ўрад Савецкай Расіі, не прынялі пад увагу інтарэсы беларусаў. Беларусь не атрымлівала нічога на аднаўленне разбуранай у час вайны гаспадаркі, таму што ўрады Германіі і Савецкай Расіі ўзаемна адмовіліся ад пагашэння страт, прычыненых вайной насельніцтву гэтых дзяржаў. Частку Гродзеншчыны і Віленшчыны немцы збіраліся перадаць Літоўскай дзяржаве. Па дагаворы немцаў з украінцамі тэрыторыя Гомельскага, Пінскага, Кобрынскага і частка Пружанскага паветаў на поўдзень ад Палескай чыгункі пераходзілі пад уладу УНР, а канчатковае ўстанаўленне граніцы Беларусі і Украіны павінна было стаць прадметам асобных перагавораў.

Як адзначаў Макар Краўцоў, "Беларусь была парэзана на кавалкі, без ніякае згоды на гэта з яе боку, без ніякага яе голасу пры гэтым. Хаця бальшавікі адкаціліся далёка на ўсход ад старога фронту імперыялістычнай нямецка-расійскай вайны, але немцы трымалі і гэты стары фронт, як моцны кардон, не даючы магчымасці яднацца раней акупіраванай імі частцы Беларусі з рэштаю яе на Усходзе". Геапалітычная сітуацыя для беларусаў яшчэ ўскладнялася і тым фактам, што ў сакавіку 1918 года ў Берліне адбылася сустрэча прадстаўнікоў кіруючых партый рэйхстагу з кіраўнікамі польскіх арганізацый. Разглядалася пытанне пра магчымасць перадачы Германіяй Польшчы беларускіх зямель Гродзеншчыны і часткі Міншчыны ў якасці кампенсацыі за адказ палякаў ад прэтэнзій на Познаньшчыну. У сувязі з гэтай сустрэчай Выканаўчы Камітэт Рады І Усебеларускага з'езда і Народны Сакратарыят БНР накіравалі германскаму рэйхсканцлеру Гертлінгу мемарандум, заяўляючы, што "падобны акт (перадача зямель беларускіх Польшчы) нарушыў бы самыя жыццёвыя інтарэсы беларускага народа і значнай большасці нацыянальных меншасцяў Беларусі і была б палічана народнымі масамі, як цяжкая знявага". Менавіта гэты факт, побач з заключэннем Брэсцкага міру, і абумовіў у значнай ступені прыняцце 25 сакавіка 1918 г. Радай БНР 3-й Устаўной граматы. Як адзначаў член Рады БНР П.А.Крэчэўскі, "выхаду не было, а чуткі і розныя навіны ўсё раслі... Краіна з пятнаццаімільённым насельніцтвам, пра якую раней амаль ніхто не ведаў, ці больш правільна, не хацеў ведаць, стала арэнай міжнародных несумленных пагадненняў, — пра яе ішла спрэчка-гутарка ўжо ў Германскім Рэйхстагу. Там, пад уплывам палякаў і іншых, партыя рэйхсканцлера, а пра гэта Рада мела дакладныя звесткі, схілялася да падзелу Беларусі".

Умовы і гандаль беларускім народам і тэрыторыяй паміж палякамі і немцамі патрабавалі выяўлення юрыдычнага аблічча ад Беларусі. Нельга было пратэставаць супраць падзелу, калі дзялілі тыя, каму яшчэ належаў суверэнітэт над Беларуссю і для каго гэты раздзел быў толькі ўнутранай справай Расіі.

25 сакавіка 1918 года была прынятая 3-я Устаўная Грамата. Граматаю Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай і вольнай дзяржавай. Брэсцкі мірны дагавор, падпісаны за Беларусь чужым урадам, паводле граматы, абвяшчаўся страціўшым моц. Зыходзячы з гэтага, урад Беларусі звярнуўся да зацікаўленых бакоў з прапановай перагледзець умовы Брэсцкага міру. Гэта быў неабходны і лагічны адказ на суровыя выклікі часу. Разам з тым дадзены акт стаўся адной з перадумоў для чарговых крокаў па шляху да ўсталявання беларускай дзяржаўнасці, ажыццёўленых ужо на савецкай аснове.

Безумоўна, абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, дзейнасць яе ўрадавых структур — Народнага Сакратарыята і Рады, з'явілася першым крокам на шляху стварэння дзяржаўнасці Беларусі. Неаспрэчным з'яўляецца тое, што самім фактам утварэння БНР пытанне аб праве беларускай нацыі на самавызначэнне было пастаўлена ў плоскасць практычнай рэалізацыі. Разам з тым БНР была дзяржаўным утварэннем у стадыі фарміравання. Хаця БНР абвяшчалася ў межах этнаграфічнага рассялення беларусаў, але юрысдыкцыю на гэтай тэрыторыі не ажыццяўляла. Не было арміі, паліцыі, адсутнічала фінансавая сістэма. Сфарміраваная ўлада на месцах абмяжоўвалася прадстаўніцтвам пры акупацыйных уладах. Весці гутарку аб гарантыі правоў беларускага насельніцтва ва ўмовах акупацыі наогул немагчыма.

Абвяшчэнне незалежнасці БНР вызначыла новы этап у палітычнай гісторыі Беларусі, у тым ліку ў гісторыі яе дыпламатыі. Незалежная дзяржава магла на законнай падставе патрабаваць вываду замежных войск са сваёй тэрыторыі, вяртання адарваных зямель, прэтэндаваць на кампенсацыю страт, якія прынесла вайна беларускаму насельніцтву, атрымаць матэрыяльную і фінансавую дапамогу з боку замежных дзяржаў. Аднак адстойваць інтарэсы Беларусі на міжнароднай арэне было няпроста. Фактычна абвяшчэнне незалежнасці Беларусі адбылося ва ўмовах акупацыі большай часткі яе тэрыторыі войскамі Германіі. Улады Германіі адмеслеся да акта ўтварэння Беларускай дзяржавы скептычна, бо лічылі беларускі нацыянальны рух недастаткова развітым і разглядалі Беларусь як разменную манету ў палітычным гандлі з кіраўніцтвам РСФСР. Разам з тым немцы не перашкаджалі беларусам ажыццяўляць пэўныя акцыі ў сферы міжнароднай палітыкі. У перыяд з вясны да восені 1918 г. Рада БНР і створаны ёй урад зрабілі першыя крокі на шляху да ўстанаўлення рэальнай дзяржаўнасці з усімі яе атрыбутамі, у тым ліку дыпламатычнай службай. Урад БНР падтрымліваў кантакты з Украінай, Літвой, Латвіяй, Эстоніяй, германскім камандаваннем на акупіраванай Беларусі, а потым з Германіяй, Чэхаславакіяй. Савецкі ўрад таксама не ігнараваў БНР. У Маскве дзейнічала консульства БНР на чале з А.Бурбісам. У лістападзе 1918 г. А.Луцкевіч вёў у Маскве перагаворы з У.Леніным аб стварэнні беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Тым не менш застаецца гістарычным фактам, што месца для самастойнай Беларускай Рэспублікі ў геапалітычнай прасторы Усходняй Еўропы тагачаснае палітычнае кіраўніцтва Германіі не бачыла, дакладней, не хацела бачыць.

Абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе ўрадавых структур садзейнічалі актывізацыі дзяржаваўтваральнага працэсу на савецкай аснове, які стаў рэальнасцю пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад войскаў кайзераўскай Германіі. Так, кіраўнік спраў Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі В.Кнорын сведчыць аб тым, што ў перыяд нямецкай акупацыі адбываўся працэс "засвойвання масамі ідэі беларускай незалежнасці, якой партыі трэба было надаваць увагу... БССР была заснавана для таго, каб забяспечыць уплыў на масы, якія ішлі за буржуазнымі нацыяналістамі". Таму можна пагадзіцца з тымі аўтарамі, якія лічаць, што з пункту погляду вырашэння праблемы самавызначэння Беларусі абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ў сакавіку 1918 г. і заснаванне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў студзені 1919 г. уяўлялі сабой "звёны аднаго працэсу", аб'ектыўна абумоўленага гістарычнага працэсу станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці беларусаў.

У наступныя дзесяцігоддзі якраз Беларуская ССР як палітыка-тэрытарыяльнае ўтварэнне ў складзе СССР з фармальнымі атрыбутамі нацыянальнай дзяржаўнасці сабрала вакол мясцовага цэнтра ўлады асноўную частку этнічнай тэрыторыі беларусаў і ў 20—80-я гады XX ст. аб'ектыўна адыграла ролю дзяржаўна-палітычнага ды культурнага інтэгратара, свайго роду апорнай канструкцыі ў працэсе фарміравання беларускай нацыі. На аснове БССР у 1991 годзе была абвешчана суверэнная Рэспубліка Беларусь.

Лявон БАРШЧЭЎСКІ
старшыня Партыі БНФ.

Першы ўрад БНР — Народны Сакратарыят: (злева направа, сядзяць) Алесь Бурбіс, Іван Серада, Язэп Варонка (старшыня), Васіль Захарка; (стаяць) Аркадзь Смоліч, Пётра Крэчэўскі, Кастусь Езавітаў, Антон Аўсянік, Лявон Заяц.



Паштоўка з выявай герба БНР.

Магілёўшчына супраць

Збор подпісаў супраць будаўніцтва беларускай АЭС будзе арганізаваны ў Чэрыкаўскім раёне Магілёўскай вобласці.

Як паведаміў БелаПАН арганізатар кампаніі Раман Раждзественскі, збор подпісаў пройдзе ў межах грамадскай антыядзернай ініцыятывы Горацкага раёна.

Паводле слоў прэс-сакратара ініцыятывы Эдуарда Брокарава, збор подпісаў супраць будаўніцтва беларускай АЭС у Горацкім раёне Магілёўскай вобласці працягваецца. Паводле звестак на 20 лютага, гэтую ініцыятыву падтрымалі ўжо больш як 1300 жыхароў рэгіёну.

Нагадаем, у лісце да прэзідэнта і ўрада Беларусі, пад якім падпісваюцца жыхары Горацкага раёна, гаворыцца: "Мы не хочам жыць на парахавой бочцы ў чаканні чарговай катастрофы. Мы заклікаем прэзідэнта, урад і парламент адмяніць прынятае рашэнне аб будаўніцтве АЭС, а неабходныя сродкі накіраваць на стварэнне бяспечных тэхналогій энергазабеспячэння".

Э.Брокараў падкрэсліў, што збор подпісаў не спыніцца датуль, пакуль рашэнне аб будаўніцтве АЭС не будзе адменена.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.

Лядовы палац замест помніка загінуўшым «афганцам»

Рэчыцкія ўлады прынялі рашэнне перанесці помнік сямі жыхарам горада, якія загінулі ў Афганістане.

На месцы помніка, што знаходзіцца на алеі "афганцаў", недалёка ад адной з цэнтральных вуліц Рэчыцы, будзе пабудавана лядовая арэна.

Улады абяцаюць перанесці помнік у парк Перамогі, ператварыўшы яго ў мемарыял усіх войнаў савецкага перыяду — ад грамадзянскай да афганскай. Жыхары горада ўсё ж здзіўляюцца, навошта пераносіць помнік, калі побач — некалькі гектараў пустуючай зямлі.

КАДРЫ

Новыя людзі ў вышэйшай судовай установе

Аляксандр Лукашэнка правёў змяненні ў складзе Канстытуцыйнага суда.

Ад сваіх абавязкаў вызвалены суддзі Ксенія Кенік і Рыма Філіпчык — "у сувязі з заканчэннем тэрміну паўнамоцтваў і выхадам у адстаўку".

Суддзямі Канстытуцыйнага суда прызначаны Аляксандр Марыскін, Валянціна Падгруша, Вольга Сяргеева і Лілія Козырава. Апошняя вызвалена ад пасады намесніка старшыні і суддзі Вышэйшага Гаспадарчага суда.

Нагадаем, Канстытуцыйны суд складаецца з 12 суддзяў. Палову абірае Савет Рэспублікі, палова прызначаецца прэзідэнтам. Старшыня суда прызначаецца прэзідэнтам з ліку суддзяў з наступным узгадненнем у Савеце Рэспублікі. Тэрмін паўнамоцтваў суддзі — 11 гадоў. Дапускаецца паўторна займаць пасаду суддзі.

8 лютага новым старшынёй Канстытуцыйнага суда прызначаны былы генеральны пракурор Пётр Міклашэвіч.

К.Кенік (1951 г.н.) і Р.Філіпчык (1952) займалі пасады суддзяў КС з красавіка 1994 года. Намеснік старшыні суда А.Марыскін (1954) працуе са студзеня 1997 года, В.Падгруша (1949) — з красавіка 1994 года. В.Сяргеева раней займала пасаду начальніка галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

ДАТА

Зварот старшыні Рады БНР з нагоды 90-годдзя БНР

Дарагія суродзічы!

У 2008 годзе беларусы ўва ўсім сьвеце адзначаюць 90-я ўгодкі БНР.

Дзевяноста гадоў таму, у надзвычай цяжкіх умовах, наш народ знайшоў у сабе адвагу і сілу абвесьціць сьвету, што ён таксама хоча быць гаспадаром ў сваёй хаце. Устаўныя Граматы БНР, і менавіта Акт 25 Сакавіка, ёсьць найбольш каштоўнымі дакумэнтамі ў гісторыі беларускага народу. Бязь іх Беларусаў магчыма ўжо не было б на гэтым сьвеце. Угодкі іх мы з удзячнасьцю мусім адзначыць.

Песымісты між намі магчыма скажуць, што няма чым цешыцца, бо ж мы ўсё яшчэ не дасягнулі нашай мэты стацца вольнай эўрапейскай краінай, такой, якімі ёсьць сёньня нашыя заходнія суседзі.

Тых, хто так думаюць, прашу прыпомніць пра перажытае ў 20 веку, пра нашую вытрываласьць, пра нашую непахісную веру ў лепшую будучыню нашага народу.

Змагаліся мы на працягу 90 гадоў супраць шалёнай русыфікацыі, баранілі нашыя найбольшыя каштоўнасьці, нашую мову і культуру, усюды, дзе маглі, прыпаміналі сьвету, што Беларусь жыве і што народ беларускі мае права, так, як і ўсе народы сьвету, на волю і незалежнасьць.

Ёсьць чым ганарыцца, ёсьць што сьвяткаваць.

Дарагія Суродзічы, абавязкам кожнага з нас ёсьць зьдзейсьніць гэты апошні высілак, які зробіць нас вольнымі людзьмі. У краінах сьвету, дзе Вы пражываеце, дайце да ведама Вашым уладам пра нязносныя адносіны лукашэнкаўскай намэнклятуры да нашай моладзі, найлепшых дачок і сыноў Беларусі, да нашай мовы і да нашай спадчыны.

Адначасна зьвярніцеся да Вашых урадаў, каб далі да ведама лукашэнкаўскаму рэжыму, што сьвет не будзе вечна талераваць зьдзеку на нашых вуліцах і праспэктах над мірнымі дэманстрантамі, якія 25 Сакавіка будуць жадаць урачыста адзначыць 90-ю гадавіну БНР, наш Дзень волі і незалежнасьці.

Разам мы асягнем нашую мэту — волю і дэмакратыю для нашага народу.

Жыве Беларусь!

Івонка СУРВІЛЛА,
старшыня Рады БНР.

(Стыль і правапіс звароту захаваны.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЛЮТАГА 2008 г.

ВЗГЛЯД ИЗ СТОКГОЛЬМСКОГО ИНСТИТУТА ПЕРЕХОДНОЙ ЭКОНОМИКИ

Удастся ли Беларуси избежать крупномасштабного экономического кризиса?

И что для этого нужно?

Доклад на такую тему подготовили специалисты Стокгольмского института переходной экономики Торбьерн Беккер и Джеспер Роини. Подготовили на основе консультаций с рядом белорусских и зарубежных экономистов и аналитиков в Минске, Киеве, Стокгольме, специалистов Международного валютного фонда и Европейского банка реконструкции и развития.

Думается, что этот профессиональный взгляд на перспективы развития нашей экономики представляет интерес для многих читателей нашей газеты. Заметим, что на днях в Минске состоялась презентация этого доклада. Ниже приводим фрагменты из него.

I. Энергетический шок

Беларусь столкнулась с проблемами в результате повышения цен на газ и потери дохода от переработки российской нефти и газа. Данный шок условий торговли имеет широкие макроэкономические, а следовательно, и общественно-политические последствия.

Его размеры велики, а цены на энергоносители будут продолжать расти вплоть до 2011 года, когда цена газа для Беларуси достигнет европейского уровня, что предусмотрено соглашением с Россией. Единственным выходом из создавшегося положения представляется глубокая структурная перестройка экономики, предполагающая сокращение госрасходов и проведение реформ, способствующих необходимой корректировке экономики.

При фиксированном обменном курсе энергетический шок в итоге приведет к сокращению экспортных доходов и увеличению расходов на импорт. Как следствие, произойдет ухудшение торгового баланса. С целью недопущения девальвации национальной валюты образовавшийся дефицит необходимо будет финансировать из внешних источников, так как альтернатива — балансирование текущего счета путем значительной реальной корректировки экспорта и импорта — труднодостижима в краткосрочном периоде. Однако заимствования могут служить лишь краткосрочной мерой облегчения переходного процесса и не могут заменить реальные изменения.

Источники финансирования кажутся достаточно очевидными: либо продажа активов, либо иностранные заимствования. Прибегнет ли Беларусь к помощи России или других схожих стран — производителей нефти — либо обратится за финансированием к Западу? Риторика белорусского правительства не дает ясной картины. Вместе с тем до сих пор все финансирование идет в основном из России.

Перспектива получения официальной помощи от Запада для финансирования дефицита торгового баланса кажется маловероятной с учетом политической ситуации в Беларуси. Однако западным странам следует взвесить свои решения, так как альтернативой является еще большее углубление зависимости Беларуси от России после продажи ей своих активов и осуществления заимствований у своего сильного соседа (что представляется более правдоподобным вариантом развития ситуации). Запад мог бы стать более вовлеченным, пытаясь способствовать продвижению реформ в необходимом направлении посредством привлечения властей к диалогу по вопросам того, что необходимо для обеспечения долгосрочного роста и повышения уровня жизни.

Следует отметить, что сегодня высока вероятность вступления Беларуси в фазу аккумулирования проблем, которые через несколько лет могут с легкостью привести к очень долгосрочному сочетанию валютного, банковского кризиса и кризиса внешней задолженности. Данный тип внешнего финансового краха происходит со многими странами мира в результате Азиатского кризиса и кризиса Аргентины и некоторых ее соседей в Латинской Америке. Так, например, в Таиланде выпуск сократился на 10,5% в следующем после кризиса году, а на возвращение к докризисному уровню дохода ушло 6 лет с совокупными потерями выпуска порядка 50% докризисного ВВП. Чтобы не допустить развития подобного сценария в Беларуси, необходимо начинать реформы уже сейчас. С другой стороны, кризис такого рода может иметь положительный побочный эффект в смысле большей демократизации страны (Индонезия), хотя с тем же успехом может привести и к серьезным экономическим и социальным последствиям для населения, которые будут сопровождаться еще более авторитарным руководством (Мьянма).

II. Что имеем?

Политическая ситуация

В 1994 году президентом стал Александр Лукашенко. В 1996 году его властные полномочия были значительно расширены, и с этого времени он стал управлять страной во все более возрастающей авторитарной манере. В целом политическое развитие при Лукашенко характеризуется концентрацией власти в руках президента, ужесточением контроля СМИ и усилением давления на политическую оппозицию.

Несмотря на диктаторский характер режима, контролирующего наиболее значимые экономические ресурсы, он все же делится частью богатства страны с населением. Некоторые аналитики называют это "социальным контрактом", по которому Лукашенко (и номенклатура) владеют властными полномочиями, но также выполняют обещание по увеличению экономического благосостояния. При реакции на газовый и нефтяной шоки правительство, вероятно, будет руководствоваться желанием сохранить такого рода "контракт".

Экономические условия до 2007 года

Большая часть выпуска концентрируется на крупных подконтрольных государству предприятиях, в которых как производство, так и занятость предопределены в соответствии с правительственными целями. Ни одна крупная компания не была приватизирована. Данный вид государственного вмешательства означает, что крупные фирмы функционируют в условиях мягких бюджетных ограничений. Компании, оказавшиеся в тяжелом положении, могут быть взяты на поруки и просубсидированы различным образом, тогда как фирмы, генерирующие значительный доход, могут столкнуться с более высокими, произвольно предъявляемыми, требованиями по налогообложению.

Малые и средние предприятия. Помимо доминирующего государственного сектора существует также частный сектор, в котором функционируют преимущественно малые и средние предприятия. Основной их деятельностью является розничная торговля и общественное питание (45% всех малых фирм) для обслуживания потребностей внутреннего рынка. Темп роста малых фирм намного отстает от темпа роста экономики. Одним из основных факторов, объясняющих медленные темпы роста и ограниченную долю в ВВП, является отсутствие стимула к росту. Если малая фирма становится относительно успешной и начинает расти, возникает высокий риск того, что государство попытается присвоить ее доходы или перевести на себя право собственности над компанией.

Здравоохранение и образование. Индекс развития человеческого потенциала ООН показывает крайне противоречивую картину в области здравоохранения и образования. Всеобщая грамотность и бесплатное и обязательное образование приветствуется с точки зрения перспектив развития. Однако расходы на образование напрямую зависят от экономической ситуации. Поэтому данная область может стать зоной риска, если разовьется полномасштабный кризис платежного баланса.

Несмотря на быстрый рост и высокие расходы на здравоохранение в Беларуси, ситуация в данной области не внушает оптимизма. Хотя расходы на здравоохранение в процентах к ВВП сравнимы с Польшей, ожидаемая продолжительность жизни за последние десять лет сократилась на 3 года и составляет около 63 лет для мужчин и 75 для женщин.

Коррупция. В Беларуси серьезные проблемы с коррупцией. Вопреки официальной информации о сокращении уровня коррупции в Беларуси, индекс восприятия коррупции, рассчитываемый организацией Transpatency International, демонстрирует тенденцию к резкому снижению после включения Беларуси в список анализируемых стран в 2002 году. В сфере коррупции Беларусь занимает 151-е место из 163 стран и разделяет его с Узбекистаном, но находится ниже Таджикистана и Туркменистана и немного выше таких стран, как Гаити, Ирак, Мьянма, Судан и Демократическая республика Конго. Данную ситуацию можно назвать катастрофической. По сравнению с другими постсоветскими странами в нашей части света Беларусь сегодня находится в конце списка, хотя еще пять лет назад занимала лидирующую позицию.

Стоимость ведения бизнеса. Стоимость ведения бизнеса в Беларуси очень высока. Начиная с 2003 года Всемирный банк проводит классификацию стран по ряду критериев, имеющих отношение к простоте ведения бизнеса, таких как легкость открытия бизнеса, лицензирование, найм работников и уплата налогов. Среди 175 стран Беларусь занимает 129-е место по легкости ведения бизнеса. Для сравнения: Россия занимает 96-е место, Польша - 75-е, Эстония - 17-е, Литва - 18-е. Деспотизм налоговой системы и низкая защищенность инвесторов увеличивают издержки ведения бизнеса. Воплощением этого является правило "золотой акции", которое дает государству право контрольного пакета, даже если оно владеет небольшим числом акций. В 2004 году данное правило было расширено и распространяется на фирмы без государственного участия в капитале, давая правительству право вмешиваться в дела любой приватизированной компании.

III. Почему без реформ не обойтись?

Значительная часть кредитов в последнее время направляется на государственные предприятия. Учитывая, что в данном процессе высока роль директивного кредитования (которое не всегда основано на рациональных финансовых расчетах), а также увеличения привлечения банками краткосрочных ресурсов в иностранной валюте, появляются причины для беспокойства.

Юридически обменный курс прикреплен к российскому рублю, но на практике — к доллару США. Недавнее повышение заработной платы не сопровождалось соответствующим ростом производительности, что сделало Беларусь менее конкурентоспособной и начинает вредить экспортным поставкам в Россию. Высокий внутренний спрос вызвал существенный рост импорта, который привел к ухудшению состояния текущего счета (профицит в 1,6% от ВВП в 2005 году сменился дефицитом в 4% от ВВП в 2006 г.). Ограниченные резервы центрального банка в иностранной валюте и переоцененная национальная валюта создают давление к девальвации.

Предполагая, что количественные характеристики экспорта и импорта не изменятся под воздействием новых соглашений по нефти и газу, становится достаточно просто подсчитать прямые потери для торгового баланса. В 2007 году совокупный эффект нефтяного и газового шока оценивается порядка 1,7 млрд долларов, что является эквивалентом 5% от ВВП, и будет расти, достигнув к 2011 году 4,7 млрд долларов.

Более широкие макроэкономические последствия шока оценить сложно, так как они зависят от реакции на него как правительства, так и других экономических агентов. МВФ приходит к оценке потери на уровне 10—15% от ВВП. Притом, что данный прогноз основан на опыте подобного рода шоков во многих странах, в Беларуси существует ряд факторов, таких как фиксированный обменный курс, жесткая структура экономики и слаборазвитые институты, которые скорее всего усилят воздействие шока условий торговли на рост.

Последствия могут быть гораздо серьезнее, чем предсказывает МВФ и другие организации.

IV. Что должно быть сделано?

Очерченная выше политическая ситуация, экономическая структура, отсутствие реформ, слабые институты и высокие издержки ведения бизнеса со всей очевидностью говорят о необходимости реформ. Список обязательных реформ является достаточно длинным, но среди основных элементов можем отметить:

— усиление институтов (включая верховенство закона, демократию, систему взимания налогов и т.д.);

— уменьшение роли государства в бизнесе;

— более свободное установление цен и заработной платы для обеспечения эффективного распределения ресурсов и создания эффективной на международном уровне экономики;

— исключение субсидий, которые не связаны с необходимыми трансформациями сельского хозяйства, промышленности и финансового сектора;

— отмена управляемого финансирования предприятий банками, то есть все финансирование компаний должно осуществляться на рыночной основе и условиях, а не по распоряжению правительства;

— рассмотрение альтернатив текущей монетарной политике и политике обменного курса;

— увеличение эффективности использования энергии и обеспечение полной передачи издержек, связанных с возросшей ценой на энергоносители, во все сектора экономики;

— продолжение развития высокого образовательного уровня населения и сосредоточение на создании новой промышленной структуры и общества, которые черпали бы конкурентные преимущества из высокого человеческого капитала, а не энергетических субсидий;

— проведение реформы системы здравоохранения с повышенным вниманием к качеству, эффективности и усилий по изменению ухудшающего здоровья, особенно среди мужчин.

В дополнение к необходимым структурным реформам существует ряд мер, способных сгладить негативные воздействия шока в краткосрочном периоде. Одними из наиболее безотлагательных мер могут быть:

— выпуск облигаций на внешнем рынке или использование внешних займов в сочетании с устойчивой стратегий управления долгом (только как средство смягчения негативного влияния шока, а не замены реформ);

— приватизация государственных компаний;

— ужесточение фискальной и монетарной политики;

— сокращение прямого финансирования предприятий;

— девальвация рубля с целью сокращения импорта и увеличения конкурентоспособности экспорта, что может быть очень рискованным, так как курс рубля является номинальным якорем и должен рассматриваться как часть комплексной программы реформ.

V. Будет ли? Или реакция государства на шок

Правительство предпримет все возможные меры по недопущению резкого сокращения производства, девальвации валюты и быстрого роста инфляции. Экономический рост и стабильность цен являются ключевыми элементами социального контракта и попытки представить существующий экономический, общественный и политический уклад в качестве удачной альтернативы рыночно ориентированному прозападному демократическому обществу. Поэтому так необходимая на данном этапе перестройка всей экономической системы вряд ли будет осуществлена. Скорее всего деятельность правительства будет сосредоточена на принятии краткосрочных мер недопущения полномасштабного кризиса платежного баланса, который бы имел серьезные последствия для национальной экономики.

На данном этапе правительству удалось обеспечить больший приток иностранной валюты, чем ее отток, и резервы увеличились с 1,4 млрд долларов на конец 2006 года до 2,4 млрд в июле 2007 года. Однако такая ситуация сложилась после получения 625 млн долларов от продажи 12,5% акций "Белтрансгаза" "Газпрому" и увеличения внешних заимствований банков для погашения долга перед "Газпромом" в размере около 500 млн долларов.

Необходимость привлечения иностранных ресурсов приведет к резкому увеличению отношения долга к ВВП, несмотря на его изначально низкий уровень. С выпуском облигаций на международных рынках экономика Беларуси будет все более детально исследоваться иностранными инвесторами и станет более подверженной колебаниям на финансовых рынках, и, как следствие, шокам, которые связаны с капитальным, а не текущим счетом платежного баланса.

Беларусь и в дальнейшем будет зависеть от российской поддержки. Несмотря на всю риторику, окружающую переговоры по нефти и газу, Россия все равно остается основным источником внешнего финансирования и ближайшим союзником на международной арене. Российские банки приобрели два белорусских банка; "Газпром" приобрел долю "Белтрансгаза"; дополнительные ресурсы планируется получить за счет правительственных займов и выпуска казначейских облигаций на российском рынке. Это также может быть началом крупномасштабной интеграции белорусской экономики в российскую, и альтернативой союзу на политическом уровне. Продажа всех активов экономики в конечном счете приведет к значительному ослаблению позиции Лукашенко.

Он понимает это, и сделал ряд более дружественных по отношению к ЕС высказываний во время переговоров с Россией. Отношения с Венесуэлой и Ираном также могут рассматриваться как попытка снижения российского влияния.

Лукашенко высказал возражение по поводу продажи приносящих прибыль компаний. Однако продажа убыточных компаний однозначно не сможет создать поток иностранной валюты, необходимый для финансирования дефицита. Высока и вероятность того, что львиная доля иностранных ресурсов будет увеличивать долг, что повысит риск кризиса.

Подготовил к печати Алесь ДРАБЧУК.

На 6 працэнтаў

Як паведаміла прэс-служба прэзідэнта, памер пенсій у сярэднім павялічыцца амаль на 6 працэнтаў. У выніку сярэдняя пенсія па ўзросце складзе больш за 365 тыс. рублёў. Была — 333, 8 тыс. рублеў.

Нядаўна на пяць долараў выраслі камунальныя плацяжы, яшчэ раней цэны. Ці хопіць пенсійнай дабаўкі на ўзросшыя траты?

Ул.інф.

Рашэнне правільнае, але ці не занадта запозненае?

"Ставіцца задача максімальна зніжаць энергазатраты на вытворчасць адзінкі прадукцыі", — заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі на пасяджэнні прэзідыума Савета міністраў.

Як зазначыў С.Сідорскі, *"у Беларусі неабходна на працягу двух-трох гадоў перавесці прадпрыемствы на энергазберагальны прынцып працы". "У нас ёсць унікальная магчымасць на працягу двух-трох гадоў выбудаваць новую энергасістэму нашых прадпрыемстваў*, — лічыць прэм'ер. — *У перспектыве газ усё роўна будзе па 300 долараў за кубаметр, энергарэсурсы будуць даражэць, гэта зразумела ўсім"*. Пакуль жа, паводле слоў Сідорскага, Беларусь купляе газ па цане значна ніжэй, чым суседнія краіны. *"І трэба за некалькі гадоў, выкарыстоўваючы спрыяльныя магчымасці, атрыманыя ў выніку дамоўленасцяў з Расіяй, максімальна хутка перавесці прадпрыемствы на энергазберагальны прынцып працы"*, — заявіў прэм'ер-міністр.

Марына НОСАВА.

ЛЮСТЭРКА СНД

Дзе шпарчэй нарошчваюць тэмпы будаўніцтва жылля?

Афіцыйныя прапагандысты раз за разам сцвярджаюць, што Беларусь па многіх паказчыках наперадзе ўсяго СНД. Але вось у прэс-рэлізе Статыстычнага камітэта СНД прыведзены даныя па будаўніцтве жылля ў краінах Садружнасці ў 2007 годзе. З іх вымалёўваецца зусім іншая карціна. А будаўніцтва жылля — важнейшы паказчык, які адлюстроўвае сапраўдны клопат аб працоўных і сведчыць аб тым, што і краіна, і грамадзяне маюць сродкі на паляпшэнне жыллёвых умоў.

Будаўнічыя краны ў гарадах і сельскай мясцовасці — яскравы сімвал развіцця. Ды што ж ён "паказвае" ў розных краінах СНД? А вось паглядзіце.

Будаўніцтва жылля ў краінах СНД у 2007 годзе

Краіна	Тысяч кв. метраў агульнай плошчы	У % да 2006 г.
Азербайджан	1426	117
Арменія	469	128,3
Беларусь	4678	114,1
Казахстан	8104	129,8
Кыргызстан	688	118,6
Расія	60.350	119,4
Таджыкістан	583	120,8
Узбекістан	5831	108,1
Украіна	6130	121,5

Даныя толькі за студзень—верасень.

Як бачым, Беларусь летась павялічыла будаўніцтва жылля ў параўнанні з 2006 годам толькі на 14,1 працэнта, у той час як Азербайджан — на 17 працэнтаў, Арменія — на 28,3, Казахстан — на 29,8, Расія — на 19,4, Таджыкістан — на 20,8, Украіна — на 21,5 працэнта. Дык дзе шпарчэй нарошчваюць тэмпы будаўніцтва жылля?

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Кошты выраслі, ездзіць сталі меней

У студзені 2008 года ў Беларусі ўсімі відамі транспарту (акрамя гарадскога электрычнага) перавезена 118 млн чалавек, што на 10,3% менш, чым у студзені 2007 года. Перавозкі пасажыраў аўтамабільным транспартам знізіліся на 10,7%, чыгуначным транспартам — на 3,5%.

У ліпені 1915 г. С.Булак-Балаховіч атрымаў першае афіцэрскае званне прапаршчыка (адна зорачка на афіцэрскім пагоне), а ў 1917 г. быў ужо штаб-ротмістрам (чатыры зорачкі). Ён вылучаўся асаблівай мужнасцю і знаходлівасцю, значыць - і баявой удачай. Камандаваў армейскім партызанскім конным атрадам (а гэта — 500 чалавек) з верасня 1916 г., прарываўся з ім праз лінію фронту, рабіў налёты на камунікацыі, штабы і тылы германскіх войскаў.

Поле дзеянне — Прыбалтыка

Вясной 1918 г., пасля шпіталя ў Петраградзе, крыху залячыўшы раны, С.Булак-Балаховіч запісаўся ў Чырвоную Армію, якая тады стваралася. У красавіку з байцоў свайго былога атрада ён сфарміраваў у горадзе Луга (Петраградская губерня) 1-ы Лужскі конны партызанскі полк, у хуткім часе перайменаваны ў 3-і Петраградскі.

Ранейшая партызанская дзейнасць і спрыт звярнулі на С.Булак-Балаховіча ўвагу ў Маскве. Наркам па ваенных і марскіх справах Л.Троцкі прапанаваў яму пасаду інспектара кавалерыі Чырвонай Арміі (пасаду потым доўгі час займаў С.Будзённы). Аднак С.Булак-Балаховіч адмовіўся ад прапановы, бо быў не згодны з антысялянскай палітыкай бальшавікоў.

Паступова канфлікты з прадстаўнікамі савецкай улады нарасталі. Булак-Балаховіч намагаўся ўратаваць сваіх камандзіраў (былых царскіх афіцэраў) ад арыштаў і рэпрэсій. Тым не менш працягваў служыць у Чырвонай Арміі на "лініі завесы", бо побач — у Эстоніі і Латвіі — да канца 1918 г. знаходзіліся нямецкія войскі, а немцаў ён па-ранейшаму разглядаў як галоўных ворагаў міру на ягонай зямлі.

Ужо намецілася паражэнне Германіі на Заходнім фронце, сітуацыя змянілася. У Прыбалтыцы стваралася "белая" расійская армія, якая намагалася ўтрымаць у сваіх руках Пскоў, калі яго пакінуць немцы. У кастрычніку 1918 г. Булак-Балаховіч выслаў у Пскоў свайго прадстаўніка, каб дамовіцца аб пераходзе да белых свайго палка. 16 кастрычніка 1918 г. у Елізараўскім манастыры ён сабраў на нараду камандзіраў, якім давяраў. Было прынята рашэнне аб пераходзе на бок белых.

Ноччу з 5 на 6 лістапада 1918 г. полк перайшоў дэмаркацыйную лінію ў 20 км на ўсход ад Пскова. Падраздзяленні палка павялічылі склад Паўночнай арміі (як тады яна называлася) ад адной трэці да паловы. Армія была падпарадкавана эстонскаму камандаванню.

Атрад ротмістра С.Булак-Балаховіча змагаўся з чырвонымі ў раёне Пячоры на поўдзень ад Пскоўскага возера (пасля адыходу немцаў і белых з Пскова 26 лістапада 1918 г.). Ён уваходзіў у склад паўднёвай групы белых. За вызваленне Тарту ў студзені 1919 г. С.Булак-Балаховічу было прысвоена званне падпалкоўніка.

Атрад Балаховіча часта прарываўся праз лінію фронту і наносіў удары ў тыле чырвоных. У лютым 1919 г. камандуючы Паўднёвай групы генерал-маёр А.Радзянка перайменаваў атрад у конны полк імя Булак-Балаховіча пад камандаваннем самога Станіслава.

15 мая 1919 г. полк і іншыя часці, падпарадкаваныя Булак-Балаховічу, занялі горад Гдоў, за што падпалкоўнік быў павышаны ў званні да палкоўніка. Далей полк браў удзел у пскоўскай аперацыі, у выніку чаго 25 мая 1919 г. Пскоў быў заняты эстонскай арміяй і часцямі белых. Балаховіч быў прызначаны на пасаду камандуючага Пскоўскага раёна і атрымаў новае вайсковае званне — генерал-маёр. З часцей, падпарадкаваных яму, утваралася асобная зводная дывізія.

С.Булак-Балаховіч усталяваў жорсткі адміністрацыйны рэжым у Пскове і раёне. Народныя суды каралі смерцю злачынцаў і бальшавіцкіх актывістаў.

Ваенны камендант Пскова і павета С.Булак-Балаховіч разгарнуў антыбальшавіцкую прапаганду, друкуючы і распаўсюджваючы сярод насельніцтва і чырвонаармейцаў (на фронце і за лініяй фронту) адозвы і ўлёткі. Пісаў у іх: "Змагаючыся не за царскую ўладу і не за памешчыцкую, але за новую, вольную, дэмакратычную, народную, сялянска-рабочую Расію". Выступаў з лозунгамі "За зямлю і хлеб для ўсяго народа, за правы для працоўных, за новы агульнанародны ўстаноўчы сход". Для генерала Белай арміі такія лозунгі былі незвычайнымі. Гэтыя заклікі не знікалі бясследна.

У ліпені 1919 г. на бок С.Булак-Балаховіча перайшоў пяхотны полк Чырвонай Арміі ў поўным складзе.

Паміж Сцылай і Харыбдай

Аднак у кіраўніцтве Белай арміі наспяваў канфлікт паміж генераламі М.Юдзенічам і А.Радзянкам, манархістамі, якія ўвогуле складалі большасць у палітычным і вайсковым кіраўніцтве, і рэвалюцыйна-дэмакратычнай групай у Паўночна-Заходняй арміі на чале з С.Булак-Балаховічам. Ён быў на левым, эсэраўскім крыле гэтай групы. Яшчэ ў жніўні 1919 г. генерал Юдзеніч, галоўнакамандуючы Паўночна-Заходняй арміяй, прызначыў Балаховіча камандуючым 2-м корпусам (з дзвюх дывізій) гэтай арміі. Аднак адносіны паміж Юдзенічам і Булак-Балаховічам усё больш пагаршаліся з-за актыўнай прапаганды, якую вёў Балаховіч.

22 жніўня 1919 года М.Юдзеніч аддаў загад палкоўніку Б.Перамыкіну заняць Пскоў, арыштаваць С.Булак-Балаховіча і аддаць яго пад ваенны суд "за беззаконныя дзеянні" падчас кіравання Псковам і паветам". У выніку афіцэры балаховіцкага штаба былі арыштаваны, а яго начальнік палкоўнік Стаякін забіты. Забіты быў і гарадскі галава Пскова Іваноў. Аднак Балаховічу з групай у 20 коннікаў з уласнай канвойнай сотні ўдалося вырвацца і апынуцца ў Гдове. Расправіцца з ім Юдзенічу не ўдалося, бо С.Булак-Балаховіча падтрымлівала эстонскае камандаванне, зацікаўленае ў рашучым генерале пры абароне Эстоніі ад наступу Чырвонай арміі. Фармальна Балаховіч падпарадкаваўся Юдзенічу і нават лічыўся пад "хатнім арыштам", але адразу выехаў на фронт у раён Острава (50 км на поўдзень ад Пскова). Тут на чале сваёй коннай групы (1200 чалавек) ён працягваў партызанскую барацьбу з бальшавікамі ў тыле праціўніка ажно да заключэння мірнай дамовы паміж Эстоніяй і Савецкай Расіяй (2 лютага 1920 г.) Падчас восеньскага наступу Паўночна-Заходняй арміі Юдзеніча на Петраград атрад С.Булак-Балаховіча ўдарыў на горад Порхаў (на ўсход ад Пскова) і ў тыле праціўніка перарэзаў чыгунку Петраград—Полацк.

Белыя пацярпелі паражэнне падчас гэтага наступу і адступілі на тэрыторыю Эстоніі. Юдзеніч мусіў выдаць загад аб ліквідацыі арміі і стварыў ліквідацыйную камісію, каб разлічыцца з салдатамі і афіцэрамі за службу, прапанаваў краінам Антанты перакінуць салдатаў і афіцэраў на поўдзень Расіі ў армію генерала А.Дзянікіна.

Булак-Балаховіч меў намер прымусіць Юдзеніча вярнуць вялікую суму грошай, якую той узяў з армейскай касы. Атрымаўшы неафіцыйную падтрымку эстонскіх улад, Булак-Балаховіч з групай сваіх афіцэраў у ноч на 28 студзеня 1920 г. прыехаў з фронту ў Талін, дзе ў гатэлі "Комерс" пражываў генерал Юдзеніч. Там Балаховіч арыштаваў свайго галоўнакамандуючага, а таксама генерала Крузэнштэрна і ад'ютанта, забраў у Юдзеніча больш за 227 тысяч фунтаў стэрлінгаў, 250 тысяч фінскіх марак і 110 мільёнаў эстонскіх марак. А грошы гэтыя перадаў вайсковаму пракурору арміі Вішнеўскаму. Потым прымусіў Юдзеніча падпісаць распараджэнне аб перадачы грошай на ліквідацыйныя мэты. Такім чынам значная частка гэтай сумы пайшла на выплату салдатам і афіцэрам. Аўтарытэт С.Булак-Балаховіча сярод вайскоўцаў падняўся высока, бо змучаныя вайной служакі нечакана атрымалі сродкі для далейшага ўладкавання.

С.Булак-Балаховіч адвёз арыштаваных на чыгуначную станцыю Талін, пасадзіў іх у таварны вагон і павёз з сабою на фронт. Толькі ўмяшальніцтва англійскага ўрада прымусіла эстонскія ўлады перахапіць цягнік на паўдарозе. Юдзеніч быў перавезены ў англійскую місію, аддаў рэштку грошай і "адпушчаны з мірам" (але без грошай) выехаў за мяжу як прыватная асоба. А дзёрзкі, рашучы Балаховіч вярнуўся на фронт.

Яго атрад, галоўным чынам коннікі, афіцыйна называўся Добраахвотніцкім народным атрадам. Камандзір назваў яго Беларускім. Атрад папаўняўся добраахвотнікамі. На пачатку 1920 г. у ім налічвалася 1200 чалавек. Палову афіцэраў і 75 працэнтаў жаўнераў атраду складалі беларусы. Беларускі атрад выпускаў паштовыя маркі наміналам ад 5 капеек да 1 рубля з надпісам на прчатцы канверта "Асобны Беларускі атрад".

Пасля замірэння Эстоніі з бальшавікамі С.Булак-Балаховіч звярнуўся да кіраўніка вайсковай дыпламатычнай місіі Беларускай Народнай Рэспублікі ў Латвіі і Эстоніі (у Рызе) палкоўніка К.Езавітава аб пераходзе атрада ў падпарадкаванне ўраду БНР з мэтай барацьбы за незалежнасць Беларусі. Ва ўрада БНР войска ў гэты час не было, бо тэрыторыя Беларусі была занята савецкімі войскамі.

Палкоўнік К.Езавітаў, маючы на тое паўнамоцтвы ўрада БНР, залічыў Беларускі атрад у склад войска Беларускай Народнай Рэспублікі, якое пачало фарміравацца (са згоды начальніка Польскай дзяржавы Ю.Пілсудскага) у раёне Слоніма.

Балаховіч са сваім атрадам меў намер перайсці ў Беларусь на савецка-польскі фронт. На гэта польскае камандаванне (той жа Ю.Пілсудскі) дало згоду. У сакавіку 1920 г. Беларускі атрад перайшоў Заходнюю Дзвіну і некаторы час знаходзіўся ў Брэсце, дзе быў папоўнены і атрымаў новую зброю.

Беларускі атрад у дзеянні

Ад пачатку чэрвеня 1920 г. Беларуская група (інакш — Беларуская нацыянальная армія) генерала Станіслава Булак-Балаховіча (каля 2 тысяч шабель) удзельнічала ў баявых дзеяннях супраць Чырвонай Арміі на Палессі, дзе аператыўна ўваходзіла ў склад Палескай групы войска польскага.

Ваенныя дзеянні Беларускай нацыянальнай арміі ў беларускай і ўкраінскіх частках Палесся адбываліся ва ўмовах контрнаступлення Чырвонай Арміі на Украіне ў чэрвені 1920 г. Атрады Балаховіча і тут вялі партызанскую вайну, прарываючыся ў тылы чырвоных войск у раёне Чарнобыля — Чэрэвічы. Потым, 30 чэрвеня 1920 г., яны атакавалі мястэчка Славечна (на поўдзень ад Лельчыцаў).

З ліпеня атрад пад камандаваннем ротмістра Дарскага ўзяў штурмам станцыю Вяледнікі (на паўднёвы ўсход ад Славечна), выбіўшы адтуль савецкі полк пяхоты. Быў узяты ў палон штаб 2-й стралковай брыгады, захоплены кулямёты. Адступаючы, група С.Булак-Балаховіча ўдзельнічала і ў абаронных баях на рацэ Стыр як рэгулярная вайсковая адзінка. У канцы ліпеня балаховічы абаранялі лінію на рацэ Стаход у раёне Любешава, 7 жніўня вялі баі за Заходнім Бугам.

Яны неслі вялікія страты, група скарацілася да 700 чалавек. Але прыходзілі добраахвотнікі з маладых сялян і палонных чырвонаармейцаў, нават камандзіраў. У атрад С.Булак-Балаховіча было ўключана 600 данскіх казакаў, якія былі мабілізаваны ў Чырвоную Армію пасля разгрому Дзянікіна, а цяпер перайшлі да Балаховіча. Савецкая разведка ў канцы жніўня 1920 г. ацэнвала сілы Булак-Балаховіча ў 1600 штыкоў, 400 шабель і 14 кулямётаў.

Пасля Варшаўскай бітвы ў сярэдзіне жніўня 1920 г. польскія войскі перайшлі ў наступ, з імі была і група генерала С.Булак-Балаховіча. Зноў яна вядзе на Палессі партызанскія дзеянні. Да С.Балаховіча далучаліся партызаны, што вялі барацьбу супраць савецкай улады. У сярэдзіне верасня ягоныя атрады дзейнічалі ў раёне Пінска, 26 верасня нечакана для праціўніка ўзялі горад, адрэзаўшы кіраўніцтва 4-й Савецкай арміі ад яе войскаў на фронце, на захад ад Пінска. Частка штаба 4-й арміі змагла цягніком ад'ехаць у Лунінец, частка была ўзята ў палон. Камандуючы 4-й арміі А.Шуваеў, начальнік штаба і член рэвваенсавета здолелі ўратавацца, уцёкшы на фронт, на захад ад Пінска. З Лунінца прыбыў у Пінск савецкі бронецягнік, пачаў абстрэльваць станцыю. Агнём гармат Балаховіча быў падпалены вагон са снарадамі, і бронецягнік быў знішчаны моцным выбухам. Праз два тыдні ваенныя дзеянні спыніліся. 12 кастрычніка 1920 г. у Рызе было падпісана савецка-польскае перамір'е і папярэднія ўмовы міру, якімі тэрыторыя Беларусі падзялялася на дзве часткі: Заходняя Беларусь перадавалася савецкім бокам (нават без удзелу дэлегацыі БССР) Польшчы, а на ўсходзе заставалася маленькая БССР з шасці паветаў былой мінскай губерні. Як казаў з горкай іроніяй Якуб Колас:

Далі шэсць паветаў,
Дзякуй і за гэта.

Паход на Усходняе Палессе

Станіслаў Булак-Балаховіч цвёрда стаяў за далейшую барацьбу з бальшавізмам. Пры падтрымцы начальніка Польскай дзяржавы (так называлася тады афіцыйная пасада) Ю.Пілсудскага старшыня Рускага палітычнага камітэта ў Польшчы Барыс Савінкаў яшчэ 27 ліпеня заключыў з Булак-Балаховічам пагадненне аб сумесным наступе расійскіх (сфарміраваных у асноўным з ваеннапалонных) і беларускіх вайсковых часцей у глыбіню Беларусі і Расіі для падняцця масавага сялянскага паўстання супраць бальшавікоў. Каб прыцягнуць да гэтай акцыі і яўрэйскае насельніцтва, быў створаны асобны "яўрэйскі эскадрон" на чале з паручнікам Цэйтліным. Камандуючым Рускай народнай добраахвотніцкай арміі прызначаўся Булак-Балаховіч. Ён заключыў 12 кастрычніка 1920 г. з Беларускім палітычным камітэтам у Варшаве (што займаў прапольскія пазіцыі) Паўлам Алексюком пагадненне, што цывільная ўлада ў Беларусі будзе перададзена Алексюку і яго камітэту.

У раёне Мікашэвічаў — Турава на пачатку лістапада сабралася армія, падпарадкаваная слыннаму беларускаму генералу. У ёй налічвалася 20 тысяч чалавек. У складзе арміі былі 3 пяхотныя і 1 кавалерыйская дывізіі, сялянская пяхотная брыгада, асобны "туземны" кавалерыйскі полк, полк данскіх казакаў і іншыя. Пры спрошчаным наборы ў армію Балаховіча трапілі і яго ранейшыя жаўнеры, і добраахвотнікі, якія не мелі баявога вопыту. Былі і палонныя чырвонаармейцы, і нават разбэшчаныя вайной людзі, і крымінальныя элементы, якія жылі вайной і рабавалі насельніцтва. Выпадкі гвалту і забойстваў змусілі генерала выдаць загад перад паходам ва Усходняе Палессе, што камандзіры, чые жаўнеры займаюцца пагромамі і рабункам, будуць зняты з камандавання, пастаўлены перад трыбуналам і асуджаны "адпаведна законаў ваеннага часу". "А злоўленых на гарачым учынку як жаўнераў, так і афіцэраў расстрэльваць на месцы. Пагромаў не павінна быць, і яны не будуць мець больш месца".

С.Булак-Балаховіч даў дазвол яўрэйскаму насельніцтву гарадоў і мястэчак ствараць узброеныя атрады самаабароны, каб бараніцца ад пагромаў.

6 лістапада 1920 г. з Турава армія Балаховіча ідзе наступленнем на ўсход па абодвух баках Прыпяці. Галоўны ўдар народнай арміі абрынуўся на 10-ю стралковую дывізію 16-й Савецкай арміі, якая панесла значныя страты і вымушана была адступаць. 8 лістапада войскі Булак-Балаховіча занялі Петрыкаў, 9 —мястэчка Скрыганаў. Пасля цяжкага бою Пскоўскі полк 1-й дывізіі "смерці" палкоўніка Мацвеева 10 лістапада ў 16 гадзін 40 хвілін заняў Мазыр. Праз дзве гадзіны ў Мазыр уступіла і кавалерыйская дывізія палкоўніка Паўлоўскага. Паўлоўскі сфарміраваў з палонных Мазырскі полк. У гэты ж дзень, 10 лістапада, Остраўскі полк 1-й дывізіі Балаховіча заняў Калінкавічы.

Мазыр становіцца цэнтрам ваеннай і палітычнай дзейнасці С.Булак-Балаховіча. Пасля заняцця Мазыра генерал ужо не ўтрымліваў у сакрэце свае планы ўтварэння незалежнай Беларускай дзяржавы. Камендант Мазыра генерал-маёр Яраслаўцаў тут жа аддаў загад вывесіць у горадзе на будынках бел-чырвона-белыя беларускія сцягі. Ад 12 лістапада С.Булак-Балаховіч пачаў выдаваць палітычныя акты і загады, накіраваныя на стварэнне Беларускай дзяржавы, абвясціў сябе "начальнікам Беларускай дзяржавы" і праклямаваў незалежнасць Беларусі. 14 лістапада ён выдаў загад пра фарміраванне беларускай арміі з беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Станіслаў Булак-Балаховіч абвясціў сябе галоўнакамандуючым усімі ўзброенымі сіламі на тэрыторыі Беларусі. Камандаванне Рускай народнай арміяй ён перадаў свайму брату Язэпу, надаўшы яму званне генерал-маёра. Кваліфікацыйная камісія пацвердзіла гэтае наданне. Але фактычна С.Булак-Балаховіч па-ранейшаму камандаваў усёй Саюзнай (як яна цяпер называлася) народнай добраахвотніцкай арміяй.

У Мазыр з Варшавы прыбылі І.Аляксюк і В.Адамовіч, якія заключылі з Булак-Балаховічам і Б.Савінкавым пагадненне аб прызнанні Рускай добраахвотніцкай арміяй незалежнасці Беларусі. У сваю чаргу С.Булак-Балаховіч прызначыў П.Алексюка старшынёй свайго ўрада, а ўрады В.Ластоўскага (у Коўне) і А.Чарвякова (Чарвякова) у Менску абвясцілі "звергнутымі".

Армія Балаховіча працягвала наступаць. 2-я пяхотная дывізія і група Язэпа Балаховіча, раней намесніка галоўнакамандуючага, наступалі на Рэчыцу, другая частка армій — на Оўруч і Чарнобыль. 16 лістапада атрады Станіслава з трох бакоў падышлі да Рэчыцы і пачалі баі на яе ўскраінах.

Камандаванне Чырвонай Арміі кінула на фронт новыя сілы, якія праз тыдзень ужо мелі колькасную перавагу. З боку Жлобіна контрнаступленне 16-й арміі Заходняга фронту пачалося 16 лістапада. Агульны ж план палягаў на тым, каб акружыць армію Балаховіча і знішчыць яе. Ужо 17 лістапада часці 16-й арміі з баямі занялі Калінкавічы.

Пазбягаючы акружэння, С.Булак-Балаховіч спыніў далейшы наступ у глыб Палесся. 19 лістапада пачалося агульнае адступленне. 2-я пяхотная дывізія балаховічцаў упарта абараняла Мазыр, але 20 лістапада і ён быў захоплены чырвонымі.

Асноўнай групоўцы арміі Балаховіча ўдалося ў раёне Каплічы—Якімавічы (30—40 км на поўнач ад Мазыра) па лясных дарогах, праз рэкі ў балоты прабіцца скрозь заслоны 33-й савецкай Кубанскай казацкай дывізіі і 24 лістапада фарсіраваць раку Пціч. Сам генерал у баях атрымаў рану, але не пакідаў камандавання. 26 лістапада яго войскі выйшлі праз Жыткавічы да чыгуначнай станцыі Сінкевічы ў раён размяшчэння польскіх войск. І хаця план камандавання Чырвонай Арміі — знішчыць вайсковыя сілы Булак-Балаховіча — не ўдаўся, армія гэтая была раззброена польскімі войскамі. Частка яе засталася ў 30-кіламетровай нейтральнай зоне (па 15 км па абодва бакі мяжы), якая існавала да падпісання канчатковага мірнага дагавору ў сакавіку 1921 г. і яго ратыфікацыі ў маі таго ж года. Адтуль асобныя атрады балахоывічцаў вялі партызанскую барацьбу супраць савецкай улады ажно да 1922 года.

Хоць асноўная маса сялянства яго і падтрымлівала, аднак у цэлым акцыя С.Булак-Балаховіча не мела поспеху, таму што якраз у гэты час расійскія антысавецкія сілы ў Крыме былі разгромлены, і камандаванне Чырвонай арміі змагло перакінуць у Беларусь значныя падмацаванні. Балаховіч не здолеў аб'яднаць усе нацыянальныя сілы, бо асноўная з іх — партыя беларускіх эсэраў — ставілася да яго варожа як да саюзніка Польшчы.

Беларускія эсэры ў час савецка-польскай вайны супрацоўнічалі з партыяй бальшавікоў, бо тыя абяцалі пасля перамогі над Польшчай прызнаць Беларускую Народную Рэспубліку як самастойную дзяржаву. Партызанскія атрады беларускіх эсэраў (сялянскія дружыны) ваявалі супраць Польшчы сумесна з чырвонымі партызанамі. Аднак пасля заканчэння ваенных дзеянняў бальшавікі хутка забаранілі беларускіх эсэраў, лідэраў і актывістаў арыштавалі. Булак-Балаховіча асуджалі і пасля заканчэння вайны, бо некаторыя жаўнеры (з крымінальных элементаў) працягвалі займацца рабаваннем, а ён, камандуючы, быў адказны за дзеянні сваіх падначаленых.

І публіцыст, і паэт, і падпольшчык

Пасля раззбраення асноўная частка атрадаў Булак-Балаховіча размясцілася ў Белавежскай пушчы, дзе былыя жаўнеры працавалі на лесараспрацоўцы і тартаках. Сам генерал быў залічаны ў склад польскага войска, але па-за штатам. Ён стаў старшынёй Саюза былых удзельнікаў нацыянальных паўстанняў (камбатантаў). Выдаваў публіцыстычныя кнігі, варожыя Савецкай Расіі, камуністам і Гітлеру, у якіх бачыў пагрозу незалежнасці народам Усходняй Еўропы.

Станіслаў Булак-Балаховіч быў і беларускім паэтам, творчасць якога заўважыў літаратуразнавец Ігнат Дварчанін у "Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры" (1927). Беларускія вершы С.Булак-Балаховіч апублікаваў у сваім зборніку 1930 г. Зборнік вершаў быў раней у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве, але падчас вайны знік. Два вершы былі апублікаваны А.Бяляцкім у часопісе "Спадчына" (1991, №6, с.17).

Падчас грамадзянскай вайны ў Іспаніі ў 1936—1939 гг. С.Булак-Балаховіч быў у групе назіральнікаў польскай ваеннай місіі ў арміі генерала Ф.Франка. Жыў ён у Варшаве.

На самым пачатку верасня 1939 г., калі пачалася Другая сусветная вайна, С.Булак-Балаховіч хутка арганізаваў атрад добраахвотнікаў з 300 чалавек, які падчас абароны Варшавы змагаўся на паўднёвым участку абароны горада. Пасля капітуляцыі Варшавы і акупацыі Польшчы С.Булак-Балаховіч арганізаваў падпольную арганізацыю для барацьбы з нямецкімі фашыстамі. Загінуў Станіслаў Булак-Балаховіч 10 мая 1940 г. у Варшаве недалёка ад свайго дома на вуліцы Саскай. Ён быў акружаны агентамі гестапа і застрэлены падчас спробы яго арышту. Ёсць версія, што ён быў забіты супрацоўнікамі службы дзяржаўнай бяспекі СССР, бо адзін са сведкаў здарэння казаў, што нападаючыя гаварылі па-руску. А якраз у гэты перыяд было ўстаноўлена супрацоўніцтва паміж гестапа і органамі дзяржбяспекі СССР для агульнай ліквідацыі падполля на тэрыторыі Польшчы і Заходняй Беларусі.

Паўтаруся: як палітычная фігура асоба генерала Станіслава Булак-Балаховіча безумоўна неадназначная, у многім і дагэтуль неразгаданая. Аднак несумненна: і ў дзікім віры складанейшых, непрадказальных падзей ён быў і заставаўся патрыётам Беларусі, выразна паказаў сябе змагаром за незалежнасць сваёй Бацькаўшчыны.

Сімвалічная магіла генерала знаходзіцца на Повонзках (камунальныя могілкі) на сямейным участку. Унук генерала, Мацей Булак-Балаховіч быў ініцыятарам адкрыцця памятнай дошкі непадалёку ад месца, дзе загінуў генерал Станіслаў Булак-Балаховіч. А непадалёку ад Белавежы пастаўлены помнік братам Станіславу і Юзэфу Булак-Балаховічам і іх жаўнерам.

Гэта быў незвычайны чалавек, які застанецца ў гістарычным летапісе Беларусі.

МОЗАИКА

Полный провал!

Представители мужской и женской сборных Беларуси по биатлону не смогли завоевать ни одной медали на завершившемся 24 февраля чемпионате Европы.

Последние пять лет представители Беларуси неизменно завоевывали медали чемпионата Европы: в 2007 году — шесть (три золотые, одну серебряную и две бронзовые), в 2006 году — шесть (4, 1, 1), в 2005 году — одну (1, 0, 0), в 2004 году — семь (2, 3, 2), в 2003 году — восемь (1, 3, 4).

В общем медальном зачете чемпионата Европы 2008 года первое место разделили Россия и Украина.

Место встречи изменить нельзя

Как известно, ближайший товарищеский матч национальная сборная Беларуси проведет 26 марта против турок.

Как сообщают в Ассоциации "Белорусская федерация футбола", встреча состоится в Минске, на стадионе "Динамо", и начнется в 20.00. В ближайшее время определится и бригада зарубежных арбитров.

Такой вот расклад

Проведена жеребьевка предварительного этапа волейбольной Евролиги — ежегодного турнира для мужских сборных, который ведет отсчет с 2004 года и проходил без участия наших соотечественников.

Группа "А": Великобритания, Голландия, Греция, Португалия, Словакия. **Группа "В":** Австрия, БЕЛАРУСЬ, Германия, Словения, Турция. На предварительном этапе каждая из команд будет хозяином мини-турнира. Победитель соревнований определится по итогам "Финала четырех", на проведение которого пока претендует Голландия.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

ВОКРУГ СКАНДАЛА

Шумим, братцы, шумим!

В конце прошлой недели на заседании исполкома Федерации хоккея Беларуси ее глава и министр внутренних дел Владимир Наумов сделал неожиданное заявление.

Речь шла о скандале, разгоревшемся вокруг матча национального чемпионата "Витебск"—"Гомель".

"Несколько дней я находился под сильным впечатлением этого скандала, но, посмотрев матч НХЛ "Монреаль"—"Рейнджерс", несколько поостыл: в хоккее, как видите, случается всякое, — заявил Владимир Владимирович. — *Но это не значит, что тема будет спущена на тормозах: по моей просьбе управление по борьбе с коррупцией проведет тщательное расследование обстоятельств, сопутствующих игре в Витебске. О его результатах будет объявлено на специальной пресс-конференции".*

Напомним, что незадолго до игры ряд белорусских букмекерских контор отменил принятие ставок на результат матча "Витебск"—"Гомель" из-за аномального скачка желающих поставить на выездную победу гомельчан, которые на данный момент не входят в зону плей-офф. Всплеск дал букмекерам основания для подозрений о договорном характере поединка. В итоге гомельчане взяли верх со счетом 5:2.

Надо отметить, что были у нас скандалы, связанные с договорными играми, и поглобальнее. Еще на слуху дело бывшего вратаря национальной сборной по футболу Валерия Шанталосова, которому было предъявлено обвинение в попытке подкупа игроков команды для обеспечения нужных результатов. Но сам Шанталосов — гражданин России, и недавно, как уже сообщалось, его дело было передано в российскую Генпрокуратуру.

Что же касается матча "Витебск"—"Гомель", где победу одержал явный аутсайдер с берегов Сожа, то здесь все довольно неоднозначно. Но ход делу дан.

Алесь СИВЫЙ.

КОММЕНТАРИЙ ПО ПОВОДУ

— Действительно, антикоррупционные органы уже заинтересовались вышеупомянутым матчем, приходили к нам, — рассказал корреспонденту "Народной воли" спортивный директор ХК "Витебск" **Феликс ТЫШЕВИЧ**. — Поговорили с руководством клуба, взяли списки игроков — и ушли. Но я не думаю, что здесь они "накопают" что-нибудь вообще. Это был рядовой матч, в котором очень плохо сыграл наш вратарь. Он что, первый матч играет плохо? Нет. Вот и все расследование! И если уж проводить расследования, то как тогда понимать тур в минувшее воскресенье (24 февраля), когда вообще выиграли те, кому это было надо? Тот же "Гомель" выиграл, тот же "Неман" победил...

— Насколько я понял, первыми скандал подняли букмекеры?

— Они, кто же еще?! Народ сделал ставки на "Гомель", а букмекеры поняли, что они остаются в накладе. Вот и подняли шумиху. Хотя тот, кто смотрел матч, понял бы, что ничего сверхестественного, кроме плохой игры вратаря, там не было. Но таких матчей в нашем чемпионате можно насобирать целый воз и маленькую тележку. Вспомните, когда минское "Динамо" проиграло 0:9 "Керамину". Тоже ведь необычный счет, правильно? Так почему бы не провести расследование и по "Динамо"? А судейство какое у нас? Давайте их тоже как следует "прошерстим" и проведем по ним расследование. Все это сделать можно, только мы устанем разбираться.

— В команде по этому поводу уже был "разбор полетов"?

— Провели общекомандное собрание, ребята откровенно смеются. Говорят: "Мы что, должны ориентироваться на букмекерские конторы?" Но на настроение команды вся эта скандальная шумиха не повлияла — играем, как и раньше играли.

САЛІДАРНАСЦЬ

«Дзесяць працэнтаў сваёй пенсіі, гэта 32.000 рублёў, я пералічваю на рахунак «Народнай волі»

Паважаны Іосіф Паўлавіч і ўвесь калектыў газеты "Народная воля"!

Ваша праца заслугоўвае добрых слоў удзячнасці ад нас, чытачоў. Газету чытаю з першых нумароў. Чытаюць яе і мае сябры, сваякі, дзеці. Вось паглядзіш тэлевізар — гавораць і паказваюць адно (могуць і не паказаць), пачытаю "Народную волю" — зусім іншая справа. Дзе хлусня, дзе праўда? Калі табе за шэсцьдзесят і ты ўжо можаш адрозніць катлету ад мухі, то і разабрацца, дзе хлусня, а дзе праўда, не вельмі цяжка.

Чытаеш газету, і то агорне цябе смутак, то ўзрадуешся за Беларусь і яе грамадзян. Добрыя людзі і сапраўды добра пішуць (я не пра сябе). Прачытаў двойчы Ваш, Іосіф Паўлавіч, артыкул "Дык што, Праляскоўскага пасадзілі?". І прыкра стала на душы за беларускае правасуддзе. Знайшоў нумар газеты за 2 жніўня 2007 года (маю падшыўку за ўвесь год), уважліва прачытаў і ніяк не магу зразумець, пры чым тут спадар Праляскоўскі і ягоная праўда? Толькі праз месяц падаў ён скаргу ў суд на газету і аўтара публікацыі. Столькі часу ён думаў, абразілі яго ці не?

Спакуса пакарацьь "Народную волю" ўзяла верх. Вось тут бы суддзі Таццяне Жулкоўскай засяродзіць увагу Праляскоўскага на тым, што фактычна ніхто яго не абразіў. Але наш "самы гуманны" суд не мог не задаволіць іск такога высокага начальніка, як памочнік прэзідэнта (на той час Праляскоўскі займаў менавіта гэтую пасаду). І 27 мільёнаў рэдакцыйных рублёў плакалі.

Паважаны Іосіф Паўлавіч, з гэтай гісторыі я ўцямію адно: вельмі ж вялікай косткай стала "Народная воля" ў горле ўлады. Я згодзен з тым, што няма тэрміну за глумленне над законамі. Упэўнены, што героі Вашага аповеда ўвойдуць у гісторыю беларускага правасуддзя. Нават праз дзесяцігоддзі продкі нашы будуць здзіўляцца такому "вердыкту". Прабачце Іосіф Паўлавіч, але ваша памылка ў тым, што Вы захацелі знайсці справядлівасць там, дзе яе хаваюць.

Я адчуваю, у якой цяжкай фінансавай сітуацыі знаходзіцца "Народная воля". І нам, чытачам, патрэбна дапамагчы газеце, і няхай гэта ініцыятыва будзе зыходзіць ад нас, яе прыхільнікаў. Я думаю, многія падтрымаюць маю прапанову. **Дзесяць працэнтаў сваёй пенсіі, гэта 32.000 рублёў, я пералічваю на рахунак "Народнай волі": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.**

Упэўнены, што наступіць час, калі будуць у нас вуліцы імя газеты "Народная воля", і на гэтай і іншых вуліцах будзе свята.

З павагай —

Валерый Радзівонавіч ДЗЯКОЎ, жыхар г.Слуцка.

АД РЭДАКЦЫІ

Шаноўны Валерый Радзівонавіч!

Дзякуй Вам за ўвагу да "Народнай волі".

Дзякуй Вам за свой погляд на артыкул "Дык што, Праляскоўскага пасадзілі?".

Дзякуй Вам за ініцыятыву наконт падтрымкі газеты.

З-за рэпрэсій улад "Народная воля" сапраўды трапіла ў фінансавую пастку. І, скажам шчыра, сёння для рэдакцыі любая дапамога мае лёсавызначальнае значэнне. І калі Ваша прапанова знойдзе водгук у многіх чытачоў, то, упэўнены, крызіс будзе пераадолены.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

К нам едет Фазел

В середине первой декады марта Минск посетит глава Международной федерации хоккея швейцарец Рене Фазел.

По словам председателя Федерации хоккея Беларуси Владимира Наумова, после чемпионата мира в Канаде пройдет генеральный конгресс международной федерации, и Рене Фазел намерен изучить позицию нашей страны по ряду вопросов мирового хоккея, которые будут на нем озвучиваться. Нам в свою очередь, интересны его рекомендации Беларуси как кандидату на право проведения мирового чемпионата-2014. Визит продлится два дня: 5 и 6 марта.

ІНІЦЫЯТЫВА

Уладзімір ПАРФЯНОВІЧ: «За ўжыванне допінгу — пад суд»

З года ў год беларускія спартсмены з зайздросным пастаянствам наступаюць на адны і тыя ж граблі. Раз за разам паступае інфармацыя, што той ці іншы беларускі спартсмен злоўлены на ўжыванні допінгу.

За ўжыванне забароненых прэпаратаў былі дыскваліфікаваны лёгкаатлетка Алена Іванова, штангістка Таццяна Грамыка, прадстаўніца вольнай барацьбы Васіліса Марзалюк.

Апошнім часам трывожныя "допінгавыя" навіны зноў прыйшлі з нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы...

Усім зразумела, што допінгавыя скандалы, звязаныя з беларусамі, неабходна неяк спыніць.

Трохразовы алімпійскі чэмпіён, дзевяціразовы чэмпіён свету і Еўропы Уладзімір Парфяновіч прапаноўвае ўвесці крымінальную адказнасць за ўжыванне допінгу.

Распачынаць, як водзіцца, трэба з сябе самога. Вось і Парфяновіч у нядаўнім інтэрв'ю газеце "Прессбол" прызнаўся, што толькі адзін раз за ўсю спартыўную кар'еру ўжыў допінг. *"Гэта здарылася ў 1984 годзе перад альтэрнатыўнымі спаборніцтвамі "Дружба-84", якімі нам спрабавалі замяніць Алімпіяду ў Лос-Анджэлесе",* — сказаў Парфяновіч. — *На заключны перад спаборніцтвамі збор прыехалі намеснік старшыні Спорткамітэта СССР Анатоль Колесаў і начальнік упраўлення водных відаў спорту Аляксандр Сілаеў. Усю зборную "паклалі на кушэтку". Я сказаў Анатолю Каптуру, які непасрэдна працаваў з байдарачнікамі, што адмаўляюся прымаць укол. Ён перадаў маю адмову кіраўніцтву і вярнуўся з жорсткім адказам: "Калі ты не пагодзішся, збірай рэчы і з'язджай са зборнай".*

У камандзе Парфяновіч тады застаўся, пераступіўшы праз прынцыпы. Парфяновічу ўсё ж такі зрабілі два уколы рэтабаліла — прэпарату, прыроўненага да допінгу.

Зараз Уладзімір Уладзіміравіч прапаноўвае зрабіць больш жорсткімі санкцыі за ўжыванне допінгу. Парфяновіч прапаноўвае прыцягваць да крымінальнай адказнасці тых, хто злоўлены на ўжыванні допінгу. *"Неабходна тэрмінова прыняць меры. Каб спыніць гэты брудны паток,* — лічыць Парфяновіч. — *У мяне ёсць заканадаўчы вопыт па барацьбе з наркаманіяй. Некалькі гадоў таму, у бытнасць дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, я прапанаваў унесці змены ў Крымінальны кодэкс, якія б зрабілі больш жорсткім адказнасць за вытворчасць, транзіт і захоўванне наркотыкаў. Дэпутаты прагаласавалі за гэтыя прапановы, а Лукашэнка адобрыў.*

У мяне ёсць прапанова ўнесці змяненні ў Крымінальны кодэкс у дачыненні да допінгу. Прапаную ўзаконіць крымінальную адказнасць трэнераў, спартсменаў, дактароў і функцыянераў за выкарыстанне забароненых прэпаратаў".

Парфяновіч таксама ўказвае на тое, што ў выпадку, калі спартсмен выйграе медаль, то прэміяльныя атрымліваюць таксама ўсе тыя, хто рыхтаваў яго да спаборніцтва, а ў выпадку, калі атлета злавілі на допінгу, адказвае толькі ён сам: *"Калі вінаватаму будзе пагражаць, да прыкладу, пяць гадоў калоніі строгага рэжыму, ён, відавочна, назаве тых, хто падштурхоўваў яго да парушэнняў. Чаму трэнер, урач альбо спартсмен павінен знаходзіцца за кратамі, а той, хто падштурхоўваў яго да мэты любым шляхам, — заставацца на волі?"*

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Вы — з «Народнай воляй»!, «Народная воля» — з Вамі!

Сапраўды, найскладанейшыя часы перажывае "Народная воля". І Ваша, шаноўныя чытачы, падтрымка — зарука таго, што мы вытрымаем. Можаце дапамагчы — калі ласка, дапамажыце.

У чарговы раз нагадваем: калі Вы не зрабілі **перадаплату** за сакавік, Вам трэба тэрмінова завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем кожны тыдзень. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін.

Дарэчы, многія з Вас, шаноўныя чытачы, зрабілі **перадаплату** толькі за першы квартал. Паспяшайцеся, калі ласка, зрабіць гэта і за другі квартал.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з Новага года павысіўся, то выгадна рабіць **перадаплату** з тым, каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется обязательно **печатными буквами** и обязательно отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя отч.

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* корп. кв.

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 27.02.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №